ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

ГОД ВЫДОЎНЯ XV
№ 60 (4312)
АЎТОРАК, 15 сакавіка 1932 г.

МЕНСК, Савецкая 63

Бальшавіцкае прывітаньне VII усебеларускаму зьезду прафсаюзаў. Наперад, да новых перамог!

ДА VII УСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЕЗДУ ПРАФСАЮЗАЎ БССР

Пэрыяд паміж VI і VII зьездамі прафсаюзаў Беларусі (канец 1927 году — пачатак 1932 г.) ахапляе важнейшы этап будаўніцтва сацыялізму ў СССР. Задачы гэтага этапу былі сфармуляваны тав. Сталіным на XVI зьезьдзе УсеКП(б).

«У адзнаку ад пройдзеных этапаў, пэрыяд перад XVI зьездам зьяўляецца пэрыядам агульнага наступленьня па ўсім фронце, пэрыядам узмоцненага будаўніцтва сацыялізму і ў галіне прамысловасьці і ў галіне сельскай гаспадаркі. XVI зьезд ёсьць зьезд разгорнутага наступленьня сацыялізму па ўсім фронце, ліквідацыі кулацтва як клясы і правядзеньня ў жыцьцё суцэльнай калектывізацыі».

Пастановы XVII партканфэрэнцыі намецілі сусьветна-гістарычныя задачы ў другой пяцігодцы, асноўнай палітычнай установкай якой зьяўляецца «канчатковая ліквідацыя капіталістычных элемэнтаў і клясаў наогул, поўнае зьнішчэньне прычын, якія параджаюць клясавыя рознасьці і эксплёватацыю, і перамаганьне перажыткаў капіталізму ў эканоміцы і сьвядомасьці людзей, ператварэньне ўсяго працоўнага насельніцтва краіны ў сьвядомых і актыўных будаўнікоў бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва».

Каб гэты вялізарныя перамогі дасягнуты ў гэтым ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы, на аснове бязьлітаснага перакрымага супраціўлення з усякімі ўхіламі — правым апартунізмам — галоўнай небяспекай; «левымі» загібамі, гнілым лібералізмам і прымірэнцтвам да ўсялякіх скажэньняў генэральнай лініі партыі, поўнага разгрому трацкізму, які ператварыўся ў перадавы атрад контр-рэвалюцыйнай буржуазіі.

Вялізарнейшыя гістарычныя задачы, што сталі перад пралетарыятам БССР, патрабавалі ад прафсаюзаў, гэтага «прыводнага пасу ад партыі да найшырэйшых рабочых мас»—мабілізацыі, арганізацыі і ўзначаленьня творчай актыўнасьці рабочай клясы па выкананьні пяцігодкі, шыўхільнага росту і палепшэньня матар'яльна-бытавога становішча рабочай клясы.

Прафсаюзы БССР за справаздачны пэрыяд вялі пасьлядоўную барацьбу за выразнае правядзеньне генэральнай лініі партыі ў прафработе. Парфарганізацыі Беларусі ў твары сваёй дэлегацыі на VIII зьезьдзе прафсаюзаў СССР, занялі цьвёрдую пазыцыю барацьбы з былым права-апартуністычным кіраўніцтвам УсеЦСПС. Ва ўсёй сваёй штодзённай дзейнасьці прафсаюзы БССР непрымірыма змагаліся з апартунізмам і рэшткамі трэд-юніёністычных элемэнтаў у пасабовых зьвеньнях прафапарату. Бязьлітасна выганяліся ўсе нядольныя арганізаваць і ўзначаліць творчы энтузіязм найшырэйшых рабочых мас (роспуск ЦП саюзу сувязі, СГС, зьняцьце старшыні ЦП будаўніцкіх, раду фабкомаў і г. д.) Ногаў, роспуск Заслаўскага, Старобінскага, Шклоўскага, Капыльскага.

Правільна праводзячы, пад кіраўніцтвам КП(б)Б, ленінскую нацыянальную палітыку, выконваючы ўказаньні XVI зьезду УсеКП(б), прафсаюзы БССР, як—масавая арганізацыя рабочай клясы, вялі непрымірымую барацьбу з усякімі адхіленьнямі ад лініі партыі ў нацыянальным пытаньні. Яны змагаліся супроць ухілаў у бок вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небяспекі, з ухіламі ў бок мясцовых шавінізмаў—беларускага, польскага, яўрэйскага і інш., вялі бязьлітасную барацьбу з контр-рэвалюцыйным беларускім нацыянал-дэмакратызмам, антысэмітызмам і шавінізмам ўсіх колераў.

Рабочая кляса Беларусі, пад кіраўніцтвам КП(б)Б, пры арганізуючай ролі прафсаюзаў дабілася вышэйшых посьпехаў у выкананьні пяцігодкі за 4 гады. У строй уступіў рад буйнейшых прадпрыемстваў, многія карэнным чынам рэканструяваны, асвойваюцца складаныя працэсы вытворчасьці. Асобныя галіны прамысловасьці выканалі пяцігадовы план ў 2 з паловаю-3 гады (шэйная, сельска-гаспадарчая будаўніцтва, Палесьдук і г. д.).

Побач з буйным ростам прамысловасьці шыўхільна ўзрастае колькасьць рабочых, поўнасьцю ліквідавана беспрацоўе. Колькасьць рабочых за 3 гады ўзрасла больш чым у 2½ разы і дасягнула — 91.282 чал. па цэнзавай прамысловасьці.

Прафесыянальныя саюзы БССР, арганічна ўключаючыся ўсёй масай у правядзеньне бягучых гаспадарча-палітычных задач і кампаній па зёсцы, у значнай меры забясьпечылі посьпехі сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі (узмацненьне вясковай сеткі прафсаюзаў, 25-тысячніка, шэфства, пасылка брыгад, палітыка-выхаваўчая работа).

Адозва ЦК УсеКП(б) ад 3 верасьня 1930 году, ленінскі заклік ударнікаў 1930 г. выклікалі магутны ўздым сацыялістычнага спаборніцтва. Значны штурмшок, агульнае ажыцьцяўленьне і канкрэтызацыя сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва дасягнуты ў выніку заключэньня сацыялістычнага дагавору паміж прафсаюзамі БССР і Заходняй вобласьці па XI-м пленуме ЦСПСВ. У сучасны момант сацыялістычным спаборніцтвам ахоплена звыш 65 проц. агульнай колькасьці рабочых БССР.

Шэсьць умоў тав. Сталіна былі пакладзены ў аснову работы прафсаюзаў БССР, пачынаючы з II паловы 1931 году. Пад знакам іх рэалізацыі прайшлі справаздачна-перавыбарчая кампанія ФЗМК, калдагаворная кампанія, канфэрэнцыя гаспадарча-разрахунковых брыгад, зьлёт ударнікаў, эстафеты 4-га году пяцігодкі, усебеларускія канфэрэнцыі прафсаюзаў і г. д.

Посьпехі ў выкананьні народнагаспадарчага пляну шыўхільна суправаджаліся палепшэньнем матар'яльнага і сацыяльна-бытавога становішча працоўных. Няўхільна павышаецца бюджэт рабочай сям'і, расьце зарплата, паляпшаецца камунальнае будаўніцтва, аздаравіцельная работа, паляпшаецца рабочае забесьпячэньне, грамадзкае харчаваньне.

Такавы посьпехі прафруху БССР, дасягнутыя, пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі на этапе паміж VI і VII зьездамі прафсаюзаў.

Аднак, ня бачыць асноўных недахопаў работы прафсаюзаў, не пранізаць усю іх работу бальшавіцкай самакрытыкай — было-б недапушчальна памылковым і шкодным.

У якой меры прафсаюзы БССР сталі сапраўднымі арганізатарамі мас у выкананьні 6 умоў тав. Сталіна, праналі ўсю сваю практычную работу барацьбой за правядзеньне гэтых умоў на кожным вучастку сацыялістычнай будоўлі? **У далёка яшчэ невыстарчальнай.** Хіба недавыкананьне прамфінпляну 1931 году, першых двух месяцаў 1932 году не зьяўляецца найвялікшым пацьвярджэньнем гэтага. Хіба дрэнная якасьць прадукцыі, якая выпускаецца, высокі процант браку, бою, страт, якія ляжаць цяжкім грузам на сабекошце, — хіба гэты біч вытворчасьці ня сьведчыць, што фабрычна-заводзкія камітэты на многіх прадпрыемствах і прафсаюзы ў цэлым ня сталі яшчэ ўсюды сапраўднымі арганізатарамі і змагарамі за правядзеньне шасьці сталінскіх указаньняў у жыцьцё.

Важнейшым зьвяном у барацьбе за выкананьне і перавыкананьне прафінпляну на аснове магутнага разьвіцьця сацыялістычных форм працы зьяўляецца карэнная перабудова сыстэмы зарплаты. Прафсаюзы БССР дабіліся поўных рэзультатаў у гэтай перабудове, але далёка яшчэ няпоўных. Побач з сыстэматычнай работай па перасоўваньні важнейшых галін прамысловасьці БССР у адносінах зарплаты на першае месца, побач з пэўным зрывам у галіне выкарчоўваньня ўраўнілаўкі, пераводу рабочых на простую і індывідуальную зьдельшчыну (з 63,7 проц. у чэрвені да 68,7 проц. у верасьні, у сярэднім па прамысловасьці БССР), побач з выпраўленьнем сыстэмы аплаты па саюзе шкодных рабочых так званай украінскай сыстэмы, — ёсьць яшчэ буйнейшыя недахопы. На вялікай колькасьці прадпрыемстваў дажывае яшчэ калектыўная зьдельшчына ва ўсіх яе рознавіднасьцях. Ва многіх прадпрыемствах (мэталапрацоўчая прамысловасьць, будаўнічыя работы) існуе яшчэ зьдельная аплата толькі па форме (процантны ахоп зьдельшчынай на многа перавышае процант фактычна зьдзельна - адпрацаванага часу). Рад фактаў, калі прагрэсыўна-прэміяльная форма аплаты працы праводзілася з яўнымі скажэньнямі (унутры нормы), бяз увязкі гэтай сыстэмы з асноўнай задачай вытворчасьці — ростам прадукцыйнасьці працы і зьніжэньнем сабекошту. На радзе вучасткаў яўная блытаніна ў вызначэньні сапраўды вядучых прафэсій і павышэньні іх аплаты. У выніку гэтага побач са стаўоўчымі рэзультатамі ў барацьбе з ураўнілаўкай апошняя яшчэ не дабіта. На мэталапрацоўчым заводзе **«Пралетары»** каваль 8-га разраду атрымлівае 190 руб., а каваль 5-га і 6-га разраду — 300 руб.; сьлесар 8-га разраду, які выконвае 100 проц. вымяральнікаў — 232 руб., а маляр — 302 руб. (аршанскае дэпо). Усе гэтыя факты паказваюць, што прафсаюзы БССР далёка яшчэ невыстарчальна справіліся з задачай правільнай арганізацыі зарплаты.

Такім-жа ня менш важным зьвяном зьяўляецца дзелавое ўключэньне ўсіх прафарганізацый зьверху да нізу ў барацьбу за паляпшэньне побачага снабжэньня і грамадзкага харчаваньня. Самаадданая бальшавіцкая барацьба прафсаюзаў за максымальнае здавальненьне сацыяльна - бытавых і культурных патрэб рабочых павінна пранізаць практычную работу кожнай прафсаюзнай арганізацыі. Без разуменьня гэтай задачы ўсякія разважаньні аб перабудове прафработы, аб паваротце тварам да вытворчасьці — балбатня, правы апартунізм на практыцы.

Трэба проста сказаць, што на гэтым важнейшым вучастку работы ёсьць яшчэ шматлікія факты агідных адносін з боку прафсаюзных арганізацый.

У той час, калі агульная сетка сталовак значна ўзрасла, калі пры ўсіх больш-менш буйных прадпрыемствах БССР арганізаваны закрытыя сталоўкі, хіба агідным не зьяўляецца, што пры аднолькавых нормах снабжэньня часта ў адной сталоўцы харчаваньне пастаўлена добра, абеды добрай якасьці, зжыты чаргі, захоўваецца санкрэжым, а ў другой—бруд, кашэць, смуроц, чаргі, «сэрыйная» капуста месяцамі падряд. Гэта тлумачыцца падзвычай агіднымі адносінамі раду фабзаўкомаў да пэху харчаваньня. Ды ня толькі фабзаўкомаў, але і вышэйшых прафарганізацый. ЦСПСБ выявіў у Віцебску агіднейшы прарыў на гэтым вучастку, ЦСПСБ сваячасова прапанаваў віцебскаму гарпрафсавету зьмяніць кіраўніцтва сацбытсэктарам ВГСПС. Аднак, віцебскі гарпрафсавет пасьля доўгіх прараканьняў, зьняўшы нядолжага работніка, назначыла яго... старшынёю гарстрахкасы.

З гэтага відаць, што ЦСПСБ далёка яшчэ не дабіўся карэннага павароту ўсіх прафарганізацый да пытаньняў рабочага і грамадзкага снабжэньня.

Нельга побач з гэтымі буйнымі недахопамі ня спыніцца на радзе істотных хібаў, якія ёсьць у культурным абслугоўваньні рабочай клясы. Новыя кадры, якія ідуць на прадпрыемствы, самыя розныя па сваім сацыяльным становішчы. Побач з членамі рабочай сям'і на заводы прыходзіць частка рабочай сілы з вёсак, з калгасаў. Культурна-палітычнае выхаваньне новых пластоў рабочых, дыфэрэнцыяваны падыход да выхаваўчай работы патрабуе з боку прафсаюзаў вялізарнейшай увагі. Тым больш гэта ўвага і пільнасьць неабходны таму, што ў асяродзішча рабочых часта на прадпрыемства, на будоўлю прасочваюцца клясава - варожыя элементы: кулак, рвач, дэзарганізатар вытворчасьці. Абсалютная ўвага, якою прафсаюзы павінны акружыць кожнага прыбыўшага калгасьніка, селяніна бедняка і серадняка на прадпрыемства, павінна спалучацца з рашучым выяўленьнем усяго чужога, варожа-клясавага. Трэба даваць рашучы адпор усім варожым праяўленьням на вытворчасьці. На жаль, шматлікія факты сьведчаць, што некаторыя прафсаюзныя зьвенні праяўляюць правую практыку ў гэтай галіне.

У гэтай сувязі стаіць пытаньне і аб пралетарскай **працдысцыпліне.** Даныя за 1930 і 1931 год паказваюць рост прагулаў і прастояў па няўважлівых прычынах з кварталу ў квартал. Гэтай гангрэне ў сацыялістычнай прамысловасьці прафсаюзы павінны пакласьці канец. Рост прагулаў, прастояў бязумоўна паказвае, што барацьба з імі яўна невыстарчальная. ЦКІСБ, цэнтральныя праўленьні саюзаў павінны сыстэматычна, памесячна вывучаць характар прагулаў, параджаючыя іх прычыны, перамагаючы іх усімі мерамі.

Усе гэтыя недахопы ў значнай меры ўніраюцца ў пытаньне аб стане апэрацыйнага кіраўніцтва. Дабіўшыся пэўнага палепшэньня ў справе больш канкрэтнага кіраўніцтва — прафсаюзы БССР на гэтым важнейшым вучастку работы маюць яшчэ буйнейшыя прарывы. Першапачатковае зьвяно на вытворчасьці — прафгрупа, ня гледзячы на яе колькасны рост, надзвычай яшчэ слабае. Прафгрупорг на многіх прадпрыемствах прадастаўлен самому сабе і рэдка інструктуецца. Усё яшчэ невыстарчальнае перанясьненьне прафработы ў групу, брыгаду, агрэгат, перашкаджае па-бальшавіцку мабілізаваць масы на перамаганьне вузкіх месц у пэху і на прадпрыемстве ў цэлым.

Сапраўды поўная перабудова прафсаюзнай работы, пачынаючы ад ЦСПСБ да групы ўключна, ліквідацыя вялізарнага разрыву, які яшчэ часта існуе паміж прынятай разалюцыяй і фактычнай справай, ўсямернае ўзмацненьне апэрацыйнага кіраўніцтва, праверка выкананьня — такава задача ў ажыцьцяўленьні дырэктывы партыі **па-новаму працаваць, па-новаму кіраваць.**

XVI зьезд партыі з усёй катэгарычнасьцю прапанаваў усім партыйным арганізацыям узмацніць і зрабіць больш непасрэдным сваё кіраўніцтва практычнай работай прафсаюзаў. Іменна пад непасрэдным кіраўніцтвам партыйных арганізацый Беларусі прафсаюзы БССР дасягнулі значных вынікаў. Аднак, побач з гэтым часты выпадкі зусім невыстарчальнай увагі, дапамогі і канкрэтнага кіраўніцтва прафсаюзам з боку пасобных партыйных арганізацый. Партыя з такімі адносінамі да прафсаюзнай работы будзе рашуча змагацца. Недасэньняваючы роль і задачы прафсаюзаў, як найбольш масавай арганізацыі рабочай клясы, якая зьяўляецца прыводным пасам ад партыі да рабочае клясы, нельга забясьпечыць выкананьне прамфінпляну і вялізарнейшыя задачы, якія стаяць перад партыяй у справе выкананьня народна-гаспадарчага пляну ў цэлым.

Недахопы работы прафсаюзаў зьяўляюцца ў поўнай ступені выпікам недастатковай разгорнутасьці дзейснай пралетарскай самакрытыкі ўнутры прафсаюзаў.

Пралетарыят Беларусі, пад кіраўніцтвам КП(б)Б прыходзіць да свайго зьезду прафесыянальных саюзаў загартаваным у барацьбе за пяцігодку ў чатыры гады, з бальшавіцкай волей да далейшых перамог у пабудове сацыялізму, песня згуртаваным закол камуністычнай партыі, шыўхільна правожаючы яе генэральную лінію.

Зьезд дасьць новы магутны ўрух у справе поўнага завяршэньня перабудовы работы прафсаюзаў і забясьпечэньне ажыцьцяўленьня гістарычных пастаноў XVII партканфэрэнцыі і XIV зьезду КП(б)Б.

ТЭМПЫ ЗАСЫПКІ НАСЕНЬНЯ ЗЬНІЗІЛІСЯ Ў ДВА РАЗЫ

НАНЕСЬЦІ РУЙНУЮЧЫ УДАР ПА АПАРТУНІСТЫЧНЫХ ЭЛЕМЭНТАХ, ЯКІЯ НЕ ЖАДАЮЦЬ ЗМАГАЦЦА НА ВАЖНЕЙШЫМ ВУЧАСТКУ ПАСЕЎНАЙ

40 проц. насеньня не дастае ў засеках пасеўнай

Апошняя зводка НКЗБ сыгналізуе аб недапушчальна марудных тэмпах ходу ссыпкі насенных фондаў. Ня гледзячы на тое, што 10 га сакавіка апошні тэрмін, устаноўлены ЦК КП(б)Б, мінуў, плян ссыпкі насеньня па раёнах выканан на 60,7 проц.

Па асобных культурах ссыпана: збожжавых — 66 проц., тэхнічных—43,2 проц., бульбе — 60,8 проц.

Калі папярэдняя пяцідзёўка дала прырост на 5,3 проц., дык за апошнюю пяцідзёўку прырост складае ўсяго 21 проц. Тэмпы ссыпкі насеньня зьнізіліся больш чым у два разы.

Рад раёнаў паказалі ўзор ганебных адносін да важнейшай кампаніі, дзе замест павялічэньня зьменшаны насеньня фонды. Так, па Расонскім раёне насенфонды зьнізіліся на 0,9 проц. **Барысаўскім** — 1,8 проц., **Плешчаніцкім** — 1,3 проц., **Смалявіцкім** — 0,3 проц., **Аршанскім** — 1 проц., а па **Любаньскім** — па 15,6 проц.

На мёртвым пункце знаходзіцца работа па ссыпцы фондаў у Талачынскім, Лельчынскім і Церахаўскім раёнах, дзе за апошнюю пяцідзёўку ня ссыпана піводнага кілё насеньня. Сёньня мы заносім гэтыя раёны на чорную дошку. Раённыя арганізацыі павінны ведаць, што партыя ня можа ў далейшым цярпець такіх апартуністычных адносін да важнейшай справы. Мы патрабуем неадкладных мер з боку паргарганізацый паказаных раёнаў і бальшавіцкай работы па засыпцы насеньня.

Прыведзеныя факты сьведчаць аб тым, што на мясцох барацьба за насеньне не пастаўлена ў цэнтр увагі. Прыклады перадавых калгасаў і раёнаў, якія заканчваюць ссыпку насеньня і арганізуюць міжкалгасную і міжраённую ўзаемадапамогу, не перанятыя.

Мсьціслаўскі, Лепельскі, Віцебскі, Старадарожскі Чырвонаслабодзкі і другія раёны ўжо завяршаюць ссыпку насеньня. Прыклады работ перадавых раёнаў павінны стаць здабыткам усіх іншых. Задача раённых арганізацый па-баявому ўзяцца за работу, мабілізаваць масы калгасьнікаў і разгарнуць упартую барацьбу за насеньне. Абвясьціць бязьлітасную барацьбу кулаку і яго агентам апартуністам, якія імкнуцца сарваць пасьпяховае правядзеньне веснавой сяўбы.

Зводка НКЗБ

аб ходзе ссыпкі насенфондаў па раёнах БССР на 10 сакавіка 1932 году

Назва раёнаў	Ссыпана насенфондаў у процантах да плану	У тым ліку: збожжавых	У тым ліку: тэхнічных	У тым ліку: бульбы
Асьвейскі	50,8	56,9	31,8	59,6
Бешанковіцкі	66,6	72,5	35,5	71,5
Вялыніцкі	64,0	75,0	61,9	63,0
Вушацкі	66,6	60,1	17,1	75,0
Горалкі	49,4	56,0	38,4	47,4
Гаралоцкі	44,5	55,5	24,3	45,3
Дрысенскі	42,8	54,5	33,8	38,9
Дуброўенскі	76,0	72,4	56,9	83,1
Крупскі	46,3	52,0	17,6	47,3
Лепельскі	90,8	75,8	44,7	97,0
Лёзьнянскі	82,2	95,5	52,9	83,2
Мсьціслаўскі	98,3	96,8	53,1	104,0
Полацкі	53,9	63,0	45,6	52,8
Расонскі	67,0	63,5	17,2	77,5
Сеньненскі	65,9	62,9	47,5	73,6
Сіроцінскі	52,5	73,7	57,3	48,2
Сураскі	56,7	70,2	23,1	59,6
Талачынскі	38,6	55,7	23,1	37,2
Чашніцкі	74,4	93,4	42,8	74,1
Чавускі	55,3	50,6	27,0	58,7
Шклоўскі	74,5	58,5	39,1	85,6
Асіпавіцкі	65,4	77,0	60,2	63,6
Барысаўскі	46,3	65,3	49,4	46,5
Бягомльскі	46,6	57,3	44,8	45,1
Быхаўскі	54,6	48,6	49,4	56,6
Б.-Канапелеўск.	56,6	56,1	45,0	57,3
Бярэзінскі	62,5	75,9	70,8	60,5
Веткаўскі	53,5	72,3	100,8	51,7
Вузьдзенскі	65,3	79,7	30,9	65,2
Жлобінскі	54,7	62,2	62,4	54,8
Заслаўскі	65,2	85,0	53,2	63,4
Карміянскі	62,5	70,8	50,4	63,1
Касьцюковіцкі	59,5	66,7	55,1	58,3
Клімавіцкі	75,8	69,4	61,8	76,9
Клічаўскі	73,6	91,7	67,2	71,6
Койданаўскі	56,3	55,0	45,9	58,6
Капыльскі	64,7	90,7	53,2	61,5
Крычаўскі	71,7	100,5	67,0	66,2
Лагойскі	53,6	84,4	43,7	50,2
Плешчаніцкі	81,3	77,3	80,1	83,3
Прапойскі	50,5	53,6	51,5	50,4
Пухавіцкі	71,7	69,3	35,0	72,1
Рагачоўскі	56,3	57,2	45,4	56,9
Слуцкі	51,8	70,5	37,7	49,5
Смалявіцкі	57,2	59,3	46,8	59,6
Старадорск.	80,7	62,7	31,3	83,8
Ўваравіцкі	50,0	61,2	28,8	47,5
Церахаўскі	36,8	51,6	73,8	34,6
Ч.-Слабодзкі	87,0	77,7	90,8	87,8
Чырвонапольск.	65,3	69,8	85,8	64,0
Чэрвеньскі	76,1	74,8	43,6	78,5
Чэрыкаўскі	41,8	68,5	44,0	38,2
Брагінскі	77,2	103,5	55,5	76,8
Гаўскі	45,3	45,2	30,4	45,7
Ельскі	67,9	71,6	56,3	66,7
Камарынскі	60,9	66,4	55,7	60,2
Жыткавіцкі	66,2	34,1	84,3	65,8
Лельчыцкі	24,2	36,1	22,5	22,8
Лоеўскі	65,6	73,9	46,1	66,6
Мазырскі	66,3	60,6	36,9	72,9
Нараўлянскі	57,0	42,6	37,0	65,9
Парыцкі	34,4	35,1	28,3	34,5
Любаньскі	52,3	37,5	22,3	53,0
Пятрыкоўскі	45,4	37,0	37,6	47,9
Рэчыцкі	55,8	58,6	26,4	56,7
Старобінскі	65,3	81,6	40,2	65,3
Тураўскі	54,2	41,3	42,3	56,9
Хойніцкі	64,2	90,7	21,8	63,7
Аршанскі	66,7	76,6	72,7	66,4
Бабруйскі	54,9	48,9	51,1	56,7
Віцебскі	92,2	103,0	148,7	91,1
Гомельскі	38,8	60,2	100,0	37,0
Магілеўскі	62,4	76,5	55,2	61,1
Менскі	53,0	90,0	—	50,1
Усяго па БССР:	**60,7**	**66,0**	**43,2**	**60,8**

УВАГА: зводка складзена на 10 сакавіка 1932 году па 35 раёнах, па 5 раёнах уключаны даныя на 5 сакавіка 1932 году, не ўвайшоўшыя ў зводку на 5 сакавіка 1932 г., а па рэшце раёнаў уключаны папярэднія даныя.

ЧЫРВОНАЯ ДОШКА

Скончылі збор насеньня

ВУЗЬДЗЕНСКІ РАЁН — сельсаветы: **Цеплінскі, Камянецкі, Сямёнаўскі** і калгас **«Усход».** (Магільнянскага сельсавету).

СЛУЦКІ РАЁН: калгасы імя **Ягорава** (Урэцкі сельсавет) і **«Пражэктар»** (Цараўскі сельсавет).

ЧОРНАЯ ДОШКА

Заносім на чорную дошку раёны, якія ганебна адстаюць па ссыпцы насенных фондаў і за апошнюю пяцідзёўку не дабіліся прыросту.

1. **Талачынскі** — ссыпана 38,6 проц., прырост.
2. **Церахаўскі** — ссыпана 36,8 проц., прырост 0,3 проц.
3. **Лельчыцкі** — ссыпана 24,2 проц.

Кожны гэктар яравых забясьпечыць насеньнем

Да ўсіх калгасаў і калгасьнікаў БССР

Ліст зьлёту калгасьнікаў Паланеўскага сельсавету, Койданаўскага раёну

Стварэньне насенных фондаў — важнейшае зьвяно ва ўсёй сыстэме работы па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы.

Наш Паланеўскі сельсавет, Койданаўскага раёну, на сваёй тэрыторыі налічвае 7 калгасаў. У выніку разгорнутай масавай работы мы дабіліся таго, што калгасы ў асноўным закончылі ссыпку насенных і страхавых фондаў. Яравы клін забясьпечан насеньнем. Па збожжавых культурах, бульбе, ільне і канюшыне ўжо ссыпана патрэбнага насеньня 100 проц., сарадэлі — 40 проц., лубіне — 50 проц.

Ссыпку насенных і страхавых фондаў мы цясьнейшым чынам увязалі з выкананьнем абавязацельстваў перад пралетарскай дзяржавай. План загатовак намі выканан: па збожжавых — на 104 проц., па бульбе—на 107 проц., па ільнасемі — на 200 проц.

Напярэдзе па ссыпцы насенных фондаў ідуць калгасы «Калгасьнік Беларусі», «Чырвоны маяк», якія выканалі план ссыпкі з перавышэньнем.

Адстаюць у справе арганізацыі насенных фондаў «Батрак Беларусі» і «Чырвоны прамень», якія яшчэ ня ссыпалі насеньня кармовых траў і лубіну.

Мы вітаем ініцыятыву перадавых калгасаў БССР, як «Чырвоны дырыжабль», па стварэньні фондаў міжкалгаснай узаемадапамогі. Са свайго боку мы ўносім у фонд міжкалгаснай узаемадапамогі 45 цэнт. насеньня, у тым ліку 3 цэнт. насеньня канюшыны, 3 цэнт. бульбы і 9,6 цэнт. збожжавых культур. Гэта значыць, што мы з унутраных ресурсаў ствараем насенны фонд на 33 гэкт. пасеўнай плошчы.

Гэта толькі пачын. Зараз мы дапатнова правядзем мабілізацыю ўнутраных насенных ресурсаў для ўнясленьня іх у фонд міжкалгаснай насеннай узаемадапамогі. Шляхам мабілізацыі ўнутраных насенных ресурсаў калгасаў і калгасьнікаў нашага раёну, мы забясьпечым насеньнем ня толькі свае калгасы, але дамо на сеньне і для іншых сельсаветаў.

Так, мы ўжо сёньня вызначаем з фонду насеннай пазыкі для іншых сельсаветаў 3 цэнт. канюшыны, 33 цэнт. бульбы, 5 цэнт. збожжа.

Выступаючы з гэтым лістом, мы бярэм на сябе наступныя самаабавязацельствы.

Перадавыя калгасы сельсавету бяруць на грамадзкі буксір адстаючыя ў справе ссыпкі насеньня: выклікаем на сацыялістычнае спаборніцтва Бараўскі сельсавет па ссыпцы насенных фондаў і арганізацыі міжкалгаснай насеннай узаемадапамогі. У кожным калгасе вылучаем спэцыяльныя брыгады для сухога пратручваньня насеньня з такім разьлікам, каб да 25 сакавіка пратруціць усё насеньне. Вылучаем пэрсанальна адказных членаў праўленьня за захаваньне насенных, страхавых і браніраваных кармавых фондаў. Скарыстаць санную дарогу і вывезьці ўвесь гной. Арганізуем выпуск газэт-інтэнсівак, якія будуць змагацца за добраякасную падрыхтоўку да сяўбы.

Прымаючы на сябе гэтыя самаабавязацельствы, мы зварачаемся да ўсіх калгасьнікаў БССР з прапановай шырэй разгарнуць арганізацыю міжкалгаснай насеннай пазыкі і мабілізаваць унутрыкалгасныя насенныя рэсурсы, праверыць наяўнасьць насенных фондаў і ўжываць неадкладна канкрэтныя захады па выкананьні плянаў ссыпкі насенных фондаў. Паўдарнаму рыхтавацца да сяўбы, кожны гэктар яравых забясьпечыць насеньнем — вось наш лёзунг.

Па даручэньні зьлёту калгасьнікаў Паланеўскага сельсавету: ад калгасу **«Чырвоны Кастрычнік»—Позьняк, Маляўка,** ад калгасу **«Чырвоны маяк»—Валаховіч,** ад калгасу **«Калгасьнік Беларусі»—Доўнар,** ад калгасу **«Трыбуна Радзецка»—Душэўскі,** ад калгасу **імя Максіма Горкага — Кулік,** ад калгасу **«Чырвоны прамень»—Каржанеўскі.**

Меншчына—на дапамогу ільнаводчым раёнам

Сакратар Менскага гаркому КП(б)Б тав. **Шпэктараў** у гутарцы з нашым супрацоўнікам аб ходзе падрыхтоўкі да сяўбы ў Менскім раёне падзяліўся аб вельмі каштоўным пачынаньні ў галіне мабілізацыі насенных фондаў і арганізацыі міжраённай насеннай дапамогі, якое зараз праводзіцца па калгасах Меншчыны.

Тав. Шпэктараў падкрэсьліў, што ў чацьвертым, заключным годзе пяцігодкі БССР робіць далейшы крок у галіне спэцыялізацыі сельскай гаспадаркі. У прыватнасьці, раёны з буйнымі пралетарскімі цэнтрамі, як Менскі, Гомельскі, Віцебскі і інш. перабудоўваюць сваю сельскую гаспадарку выключна ў садова - гародным і жывёлагадоўчым напрамку.

Калгасы Меншчыны павінны ў гэтым годзе поўнасьцю забясьпечыць патрэбы гораду ў гародніне і садавіне. Прыгарадныя фэрмы павінны штодзённа даваць Менску 25.000 літраў малака.

Пад гародныя культуры Менскі раён адводзіць 6.000 гэкт. і пад бульбу—15.000 гэкт. Тэхнічных культур, як лён, Меншчына ў гэтым годзе зусім ня будзе сеяць.

У сувязі з гэтым калгасы Менскага раёну арганізавалі збор насеньня ільну, якое ў іх засталося нескарыстаным, для аказаньня калгаснай сацыялістычнай узаемадапамогі ільнаводчым раёнам. Арганізаваны ў калгасах брыгады ўжо сабралі 25 тон насеньня ільну. Усяго будзе сабрана каля 100 тон. Сабранае насеньне ільну калгасы Меншчыны перададуць у якасьці ўзаемадапамогі калгасам Мсьціслаўскага ільнаводчага раёну.

За тое Меншчына, у сувязі з пашырэньнем пасеву гародных культур, адчувае недахват у насеньні гародніны і аднагадовых траў.

Другія раёны БССР павінны пасьледаваць прыкладу Менску і шляхам мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў арганізаваць збор насеньня для міжраённай насеннай узаемадапамогі. Пачын Меншчыны трэба перанесьці ва ўсе іншыя раёны БССР.

Калгасы Менскага раёну з посьпехам разгарнулі падрыхтоўку да сяўбы. Ссыпка насенных фондаў па збожжавых культурах ужо скончана. Насеннай бульбы ссыпана 90 проц. патрэбы.

Плян рамонту с.-г. інвэнтару выканан на 75 проц. Для дапамогі калгасам па завяршэньні рамонту менскія прадпрыемствы накіроўваюць у сельсаветы 27 рамонтных брыгад.

Для праверкі падрыхтаванасьці да сяўбы гэтымі днямі былі арганізаваны пробныя агляды па 6 калгасах і двох саўгасах, якія далі добрыя вынікі. З 17 па 22 сакавіка пробныя агляды падрыхтаванасьці калгасаў і саўгасаў да вясны будуць праведзены па ўсім Менскім раёне.

З 15 па 22 сакавіка па ўсіх сельсаветах праводзяцца спэцыяльныя нарады старшынь праўленьняў калгасаў, брыгадзіраў і загатоўшчыкаў калгасных фэрм па пытаньнях арганізацыі вытворчых брыгад і правільнай расстаноўкі рабочай сілы.

Дэкадзнік масавага паходу па падрыхтоўцы да сяўбы

ГЛУСК. Стварэньне насенных фондаў па калгасах праходзіць пэздавальняюча. Плян ссыпкі выканан па збожжавых на 60 проц., тэхнічных—30 проц., бульбе — 51 проц., па травах аднагадовых — 16 проц. і шматгадовых — 47 проц.

Для ўзмацненьня работы па ссыпцы насенфондаў райком, РВК і райкалгасаюз зьвярнуліся з адозвай да ўсіх калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў-аднаасобнікаў і абвясьцілі з 1 на 10 сакавіка дэкадзнік масавага паходу па падрыхтоўкі да веснавой сяўбы. Вызначана 10 прэмій калгасам, якія сваячасова выканаюць плян па ссыпцы насеньня. Увесь партактыў накіраваны на дапамогу сельсаветам і калгасам.

Раённая пасеўная тройка аб'яжджае саўгасы і сельсаветы, дзе на месцы правярае ход падрыхтоўкі да сяўбы.

К. В.

ПРЭЗЫДЭНЦКІЯ ВЫБАРЫ

Бярэзінскі раён—самы адсталы па мясазагатоўках

Дабіцца апэрацыйнага кіраўніцтва, плянавасьці у загатоўках, вытруціць ажыятаж і канкурэнцыю

Скончыць перабудову загатоўчага апарату

ЦК КП(б)Б не адзін раз падкрэсьліваў, што цэнтральнай задачай жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасных таварных фэрм зьяўляецца своячасовае і поўнае выкананьне плянаў здачы (продажу) дзяржаве таварнай прадукцыі і што выкананьню гэтай задачы павінна быць падпарадкавана ўся арганізацыйна-гаспадарчая, вытворчая і масавая работа.

Аднак, цяперашнія тэмпы жывёлазагатовак сьведчаць аб тым, што гэта дырэктыва партыі ў рабоце саўгасных сыстэм, некаторых калгасаў і загатоўчых арганізацый ажыцьцяўляецца вельмі марудна.

На 10 сакавіка квартальны плян мясазагатовак выканан па рэспубліцы на 32 проц. Па буйной рагатай жывёле загатоўлена 49,2 проц. пляну, на сьвіньнях — 10,7 проц., аўцах—35,9 проц. Калгасы здалі 42,7 проц., таварныя фэрмы — 7,4 проц., па адпаасобным сэктары, у тым ліку і з неграмадзканага стада калгасьнікаў загатоўлена 30,5 проц.

Малакапрамтрэст выканаў квартальны плян здачы тавар ной прадукцыі на 21,2 проц., Сьвіпаводтрэст — на 45,4 проц., Птушкатрусагадоўчая сыстэма — на 7,9 проц.

Такі ход кампаніі ставіць пад пагрозу бесьперабойнае снабжэньне прамысловых цэнтраў мясам. Адна з прычын такога становішча — дэмабілізацыйныя настроі на мясцох у сувязі з рэарганізацыяй загатоўчага апарату. У некаторых раёнах (Бярэзіна) плян мясазагатовак дагэтуль не даведзен нават да паасобныхвёсак.

Паведамленьне з Старых Дарог, якое мы сёньня зьмяшчаем, сыгналізуе аб тым, што кулак выкарыстоўваючы бязьдзейнасьць раду мясцовых арганізацый побач з драпежніцкім забоем жывёлы, вядзе шкодніцкую работу, накіраваную на зьнішчэньне маладняка. Клясавы вораг імкнецца падарваць адзін з важнейшых вучасткаў сацыялістычнай жывёлагадоўлі — адзіноўленьне стада. Партячэйкі, сельсаветы павінны разгарнуць бальшавіцкую барацьбу супроць кулацка-шкодніцкай работы, за захаваньне маладняка.

Неабходна ў бліжэйшыя-ж дні закончыць перабудову загатоўчага апарату, па-баявому выправіць на-хаду буйнейшыя недахопы ў ходзе загатовак, уэмацніць барацьбу з кулаком і яго агентурай.

Жывёлазагатоўкі — адна з адказных гаспадарча-палітычных кампаній. Раённыя арганізацыі, сельсаветы павінны ўзяць гэты вучастак работы. пад неаслабны кантроль, аказваючы загатоўчаму апарату практычную дапамогу і вядучы бязьлітасную барацьбу з кулацка-рэацкімі тэндэнцыямі, з раз базарваньнем мяса з цэнтралізаваных фондаў па мясцовыя патрэбы.

Ударны дэкаднік мясазагатовак

КАМАРЫН.

НА КАМАРЫНСКІМ РАЁНЕ ПЛЯН МЯСАЗАГАТОВАК НА 1 САКАВІКА БЫЎ ВЫКАНАН НА 27, 7 ПРОЦ., ШТО ПАГРАЖАЛА ЗРЫВАМ ПЛЯНУ.

ДЛЯ ЎЗМАЦНЕНЬНЯ ТЭМПАЎ ЗАГАТОВАК РАЙКОМ ПАРТЫІ АВВЯСЬЦІЎ УДАРНЫ ДЭКАДНІК МЯСАЗАГАТОВАК. УВЕСЬ ПАРТЫЙНЫ І КААПЭРАЦЫЙНЫ АКТЫЎ НАКІРАВАН У СЕЛЬСАВЕТЫ І КАЛГАСЫ.

КАМАРЫНСКІ РАЁН ПАВІНЕН У БЛІЖЭЙШЫЯ ДНІ АДГРУЗІЦЬ ЛЕНІНГРАДУ 75 ТОН МЯСА. НЕРШЫЯ 5 ДЗЁН УДАРНАГА ДЭКАДНІКА ДАЛІ ЗНАЧНЫ ЗРУХ. НА 5 САКАВІКА КВАРТАЛЬНЫ ПЛЯН ВЫКАНАН УЖО НА 41,3 ПРОЦ ЛЕНІНГРАДУ ЗА ГЭТЫ ЧАС АДГРУЖАНА 30 ТОН.

БУЙНЕЙШЫМ НЕДАХОПАМ У ХОДЗЕ КАМПАНІІ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ТОЕ, ПТО ЗАГАТОЎКІ У АСНОЎНЫМ ПРАХОДЗЯЦЬ ЗА ЛІК БУЙНАЙ РАГАТАЙ ЖЫВЕЛЫ — 68,6ПРОЦ., У ТОЙ ЧАС ЯК ПА СЬВІНЬНЯХ ЗАГАТОЎЛЕНА 7,7 ПРОЦ., А ПА АВЕЧКАХ — 25,2 ПРОЦ.

ПАРТАРГАНІЗАЦЫЯ КАМАРЫНСКАГА РАЁНУ ПАВІННА НА-ХАДУ ВЫПРАВІЦЬ ГЭТЫ НЕДАХОП, ПЕРАКЛЮЧЫЎШЫ УВАГУ НА ЗАГАТОЎКУ ДРОБНАЙ ЖЫВЕЛЫ. НЕАБХОДНА У БЛІЖЭЙШЫ-Ж ДЗЕНЬ СКОНЧЫЦЬ АДГРУЗКУ ЛЕНІНГРАДУ 75 ТОН МЯСА.

ГУЦАЎ.

Гастралёрства замест канкрэтнай работы

БЯРЭЗІНА. (Наш кар.).

Бярэзінскі раён у глыбокім тыле на выкананьні пляну мясазагатовак. На 10 сакавіка квартальны плян выкананы на 16,77 проц. Такія сельсаветы, як Бярэзінскі, Дзьмітраўскі далі толькі 3-7 проц. пляну.

Чым тлумачыцца такое становішча? Перш за ўсё тым, што яшчэ і цяпер ня значнага ліку вёсак пляны мясазагатовак не даведзены. Кіраўніцтва і апарат райзагатжывёлы бязьдзейнічае.

Сельспажытаварыствы разбазарваюць фонды, прызначаныя для стымуляваньня жывёлазагатовак. Інструктар райзагатжывёлы Друцкі займаецца гастралёрствам і прыяжджае ў сельсаветы толькі для таго, каб атрымаць чарговую зводку.

Калі Друцкаму ў адным з сельсаветаў прапанавалі правесьці канкрэтную работу на вёсцы, Друцкі пасьпешна адмовіўся. Такую-ж характарыстыку можна даць загадчыку райзагатжывёлы Гасуцкаму.

Спажывецкая кааперацыя бяз усякай падставы скарыстала на свае патрэбы каля сотні сьвіней з цэнтралізаванага фонду.

Райком партыі таксама не правіў патрэбнай рашучасьці ў барацьбе за мяса, ня выкарыстаў усіх магчымасьцяй для выкананьня пляну. Работу райкому ў гэтым напрамку характарызуе хаця-б той факт, што ён за ўвесь час не заслухаў піводнай справаздачы ячэйкі аб выкананьні пляну мясазагатовак.

ЭЛЬ.

Завяршыць ліквідацыю няпісьменнасьці

Адстаюць яшчэ 24 раёны

Баявое заданьне партыі павінна быць па-бальшавіцку ажыцьцёўлена

ТЭМПАЎ НЯ ЗЬНІЖАЦЬ ДА ПОЎНАЙ ПЕРАМОГІ

Дэкаднік генэральнай праверкі работы па ліквідацыі няпісьменнасьці даў значныя зрухі на гэтым важнейшым вучастку культурнай рэвалюцыі. Сотнямі брыгад і рэйдаў, тысячамі новых культармейцаў уключаецца краіна ў штурм адстаючых вучасткаў па фронце барацьбы за суцэльную пісьменнасьць.

Але матар'ялы цэнтральных і раённых штабаў з неабвержнай перакананасьцю сьведчаць аб тым, што ў цэлым радзе раёнаў да работы па ліквідацыі няпісьменнасьці адносіліся і адносяцца, як да зусім малаважнай справы.

Ва многіх раёнах выяўлена гэлякая колькасьць новых няпісьменных і малапісьменных. Напрыклад, у г. Мазыры выяўлена 686 няпісьменных, у Калінкавічах — 76 чал., па Беразоўскім сельсавеце гэтага-ж раёну—169 чал. Пераважная частка іх толькі зараз ахоплена навучаньнем. На Чэрыкаўскім раёне выяўлена 1.096 чал. ня пісьменных і г. д.

Ня гледзячы на агульныя зрухі, якія зрабіў дэкаднік, па многіх раёнах усё яшчэ ліквідацыя няпісьменнасьці, з прычыны апартуністычнага самацёку ў гэтай важнейшай справе, застаецца вузкім месцам, адстаючым вучасткам. Вось яны тыя 24 раёны, якія ганебна цягнуцца ў хвасьце:

Брагінскі, Быхаўскі, Крычаўскі, Камарынскі, Чачэрскі, Чэрыкаўскі, Чавускі, Глускі, Крупскі, Мазырскі, Пятрыкоўскі, Сіроцінскі, Смалявіцкі, Дрысенскі, Вушацкі, Капыльскі, Любаньскі, Бабруйскі, Клімавіцкі, Бярэзінскі, Касьцюковіцкі, Шклоўскі, Барысаўскі і Плешчаніцкі.

Да гэтых раёнаў сакратар Цэнтральнага Камітэту тав. Жаброўскі зьвярнуўся з наступнай катэгарычнай тэлеграмай:

«Дэкаднік ліквезу па вашым раёне належных вынікаў ня даў. Ператварэньне раёну да 1 мая ў суцэльна-пісьменны знаходзіцца пад непасрэднай пагрозай. Катэгарычна прапаную забясьпечыць стопроцантны ахоп вучобай няпісьменных да 45 год. Аб вынніках паведаміце тэлеграфна да 15 сакавіка».

Простым і няўхільным абавязкам для адстаючых раёнаў зьяўляецца — дабіцца крутога пералому і забясьпечыць поўнае выкананьне задачы партыі і ўраду аб суцэльнай пісьменнасьці.

Работа, якая разгарнулася ў часе дэкадніка па большасьці раёнаў БССР, ні ў якім разе ня можа згортванца. Зрухі дэкадніка трэба замацаваць. Трэба ўсамерна, яшчэ больш разьвіваць тэмпы, узьнімаць на вышэйшую ступень якасьць работы да поўнай перамогі, да поўнага завяршэньня ліквідацыі няпісьменнасьці.

Прыклад гораду—у сельсаветы

Дэкаднік генэральнай праверкі работы па ліквідацыі няпісьменнасьці даў па Барысаўскім раёне спатныя зрухі.

На заводзе імя Домбаля пры кожнай зьмене арганізаваны ліквпункты. Наладжана навучаньне 15 пісьменськіх на дому. Праведзена работа па выпрацоўцы адзінай праграмы для ліквпункту па палітычнай і тэхнічнай падгодзе.

Значныя зрухі ў часе дэкадніка дасягнуты і на фабрыцы «Прафінтэрн». З 24 пісьменных фабрыкі ўцягнуты ў ліквпункты 23, якія ахопліваюць наведваюць заняткі.

Есьць вялікія дасягненьні таксама і на іншых прадпрыемствах Барысава. Поўнасьцю ахоплены ліквпунктамі няпісьменныя на заводзе «Каміцтэрн» і на гарбарні.

На раёне ў цэлым у гэтай справе ёсьць значныя адставаньні. На сельсаветах дэкаднік генэральнай праверкі ня даў яшчэ патрэбнага зруху. Вялікая колькасьць пісьменных застаецца па-за вучобай. Напрыклад, у Лошнянскім сельсавеце, калі да 1 студзеня 1932 году навучвала ліквпункты 206 пісьменных, то па 25 лютага наведвае толькі 113 чал. Такія-ж факты назіраюцца ў Новасельскім, Жыцькаўскім і Бродаўскім сельсаветах.

У бліжэйшыя дні ўсе сельсаветы раёну павінны ліквідаваць свае адставаньні і працаваць па прыкладу гарадзкіх ліквпунктаў.

Фабрыкі і заводы Барысаву, якія з посьпехам змагаюцца за суцэльную пісьменнасьць, павінны арганізаваць дапамогу ў гэтай рабоце сельсаветам раёну.

НЭЙДЛІН.

Самацёк замест плянавай падрыхтоўкі

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). Замест выпрацоўкі плянавай падрыхтоўкі па будаўніцтва, у Віцебску назіраецца самацёк і блытаніна.

Канчаткова кантрольныя лічбы будаўніцтва яшчэ ня даны, праекты на будаўнічыя работы не дасланы, кредыты не адкрыты. Гэта не дае магчымасьці ліквідаваць падрабязныя пляны на мясцох.

Адсутнасьць лімітаў з агульнасаюзнага кошту пасобных аб'ектаў затрымлівае заключэньне дагавораў і разгортваньне ладнай работы сілы. Буйнадзяльнае дагаворы яшчэ не прыступілі да выробкі рабочых.

Мясцовыя арганізацыі не заняліся, як належыць падрыхтоўкай мясцовых будаўнічых матар'ялаў (каменьне, пяскі, лесаматар'ялы).

Пытаньні рацыяналізацыі будаўнічыя арганізацыі не займаюцца. Да гэтага часу яшчэ ня складзены пляны рацыяналізацыі і зьніжэньня сабекошту.

Цагельны пэльні пропна забясьпечаны паліваам. Цагельня № 2, якая жадала заехаць пэртыю торфу, не атрымала атаксаванага дазволу з боку аб'яднаньня «Белбудматар'ял».

„У ПОЛЕ ВЫЙДЗЕМ МЫ ТАДЫ..."

АГЛЯД ДРУКУ

„Шлях калектывізацыі", (Смалявіцкі раён)

Аб падрыхтоўцы да веснавой сяўбы «Ш. К.» загаварыў толькі ў студзені. Ужо сам па сабе гэты факт выразна сьведчыць аб тым, што газэта ня ўлічыла ўсёй важнасьці сваяго часовай падрыхтоўкі да 3-ай бальшавіцкай сяўбы. Ясна, што «Шлях калектывізацыі» павінен быў начаць прапушчанае і разгарнуць самую шырокую і баявую апэрацыйную работу па мабілізацыі мас на падрыхтоўку да пасеўнай кампаніі.

З гэтай задачай газэта яўна не спраўляецца. Апэрацыйнасьць матар'ялаў «Ш. К.», прысьвечаных падрыхтоўцы да веснавой сяўбы, кульгае на абедзьве нагі. Газэта на дзіва хутка забывае аб тых пытаньнях, якія яна сама-ж узьнімае на сваіх старонках. У гэтым — галоўная бяда «Ш. К.».

9 студзеня «Шлях калектывізацыі» апублікаваў дагавор на сацыялістычнае спаборніцтва па лепшай падрыхтоўцы да веснавой сяўбы паміж калгасамі Пухавіцкага і Смалявіцкага раёнаў. Гэтую ініцыятыву калгасных мас газэта павінна была неадкладна падхапіць і ўпарта змагацца за поўнае ажыцьцяўленьне заключанага сацыялістычнага дагавору. Нічога падобнага «Ш. К.» не зрабіў. Газэта ашыпулася ў хвасьце ініцыяты мас. Яна толькі апублікавала гэты дагавор і ўсё. Больш аб дагаворы «Шлях калектывізацыі» проста не ўспамінаў, лібыта сацыялістычнае спаборніцтва на лепшую падрыхтоўку да веснавой сяўбы можа разгортвацца самацёкам.

У адным з сваіх нумароў газэта зьмясьціла верш, насычаны самым руковым аптымізмам:

«Праменьнем сонца апалога
Зьмятуцца пухнія сьнягі
На полі праца зацкрыцца
Зазвоняць бораны і плугі...
І толькі сьнег з палёў зьгіне
У поле выйдзем тады мы
І бальшавіцкую спаткаем
Ударнай сяўбой у час вясны»...

Вось для такіх вершаў газэта знаходзіць і месца і час. Затое аб канкрэтнай падрыхтоўцы да сяўбы «Ш. К.» піша менш за ўсё, а калі і піша, дык не апэрацыйна, утапаючы ў агульных фразах. Для доваду пакажам, як газэта змагалася за своячасовае даведзеньне пасеўных плянаў да калгасных мас. У нумары «Ш. К.» ад 29 студзеня чытаем:

«Пасеўныя пляны павінны быць спушчаны ў сельсаветы і калгасы з такім разьлікам, каб ДА 1 ЛЮТАГА пляны былі даведзены і шырока распрацаваны ў масах саўгасных рабочых, калгасьнікаў і беднякоў і серадняковў—аднаасобнікаў».

Да лютага-ж аб пасеўных плянах газэта проста не ўспамінала. Маўчаць увесь час, а потым патрабаваць давесьці пляны да саўгасаў і калгасаў па працягу аднаго дня — гэта значыць проста імкнуцца зьняць з сябе адказнасьць за ўласную бязьдзейнасьць. Іменна так і паступіла рэдакцыя газэты «Шлях калектывізацыі». Патрабаваньне газэты застало ся пустым гукам. Пасеўныя пляны да саўгасаў і калгасаў у тэрмін, вызначаны газэтай, даведзены ня былі. «Ш. К.» б'е адбой. 18 лютага газэта нечакана паведамляе, што пасеўныя пляны павінны быць даведзены да... 15 лютага. «Ш. К.», як бачыце жанглюе тэрмінамі: спачатку 1-га лютага, а потым 15-га. Поўная блытаніна, якая паказвае, што з бальшавіцкай апэрацыйнасьцю ў барацьбе за своячасовую падрыхтоўку да сяўбы, газэта проста не знаёма.

Чакаючы, пакуль з палёў зьнікне сьнег пад напорам «праменьняў сонца агнявога», газэта лічыць магчымым ігнараваць такую цэнтральную задачу падрыхтоўкі да веснавой сяўбы, як ссылка насенных фондаў. Аб насеньні газэта ўспомніла з недапушчальным спазьненьнем. Да палавы лютага аб насенных фондах «Шлях калектывізацыі» нічога не пісаў. Між тым у раёне ссылка насенных фондаў праходзіла абсалютна невыстарчальна, што канстатавана раённым камітэтам партыі ў пастанове, якая зьмешчана 18 лютага на старонках «Ш. К.». Віну за такое становішча пясе, у першую чаргу, сама рэдакцыя газэты. «Шлях калектывізацыі» першы дзьве дэкады лютага проста ігнараваў барацьбу за ссылку і ачыстку насеньня. Далейшыя матар'ялы газэты аб насенных фондах носяць выключна інфармацыйны, часамі абязьлічаны характар. Так напрыклад 5 сакавіка «Шлях калектывізацыі» сыгналізуе, што:

«... рад партячэек, сельсаветаў, калгасаў і многіх насьценгазэты не разгарнулі баявой работы па стварэньні насенных калгасных фондаў. Больш таго, у радзе месц гэта работа прадастаўлена самацёку і ёсьць настрої, што насеньне дашце раён»...

Ляйя-ж гэта сельсаветы і ячэйкі—непадома. Толькі ў сваім апошнім нумары газэта робіць некаторыя спробы даць разгорнутыя матар'ялы аб ходзе ссылкі насенных фондаў у раёне. «Ш. К.» зьмяшчае чырвоную і чорную дошку, дзе называе хто і калгасаў ідзе ў авангардзе і хто адстае ў барацьбе за ссылку насенных фондаў. Але і гэтыя матар'ялы газэты носяць даволі павярхоўны характар. Газэта не дае разгорнутага аналізу вопыту работы перадавых калгасаў. Напрыклад у заметцы «Вярнуць прыклад» «Ш. К.» паведамляе, што калгас «Бальшавік» поўнасьцю скончыў ссылку і ачыстку насенных фондаў. Як, якім чынам дабіўся калгас «Бальшавік» гэтых посьпехаў—застаецца таінай. Газэта маўчыць, абмяжоўваючыся ролай інфарматара. Або другі прыклад «Ш.К.» зьмяшчае вялікі артыкул аб дасягненьнях калгасу «Культура». Даромна шукаць, аднак, у гэтым артыкуле паказу, якім чынам калгас «Культура» дабіўся сваіх посьпехаў. Газэта ня ведае далей такіх агульных заўваг пакшталт таго, што ў калгасе:

«... прыняты меры да ліквідацыі абязьлічкі і поўнага пераходу на сапраўдную зьдзельшчыну»...

Ляйя гэта меры—сакрэт рэдакцыі.

Таксама павярхоўна і ня сур'ёзна адносіцца газэта і да барацьбы за своячасовы рамонт сельска-гаспадарчага інвэнтару. «Шлях калектывізацыі» зьмяшчае верш дзе гаворыць, што

«... яшчэ мяцеліцы бушуюць,
як у кузьні звоніць малаты
плугі, бораны рамонтуюць
да бальшавіцкае вясны»...

Аднак, ніякіх крокаў да таго, каб у кузьнях сапраўды «зьнікнуць молаты», ня прыкмае. За ўвесь час газэта не дала ніякіх разгорнутых матар'ялаў аб ходзе рамонту сельска-гаспадарчага інвэнтару ў раёне.

Грубай памылкай «Ш. К.» зьяўляецца, што яна зусім ігнаруе пытаньне барацьбы за своячасовую падрыхтоўку адпаасобнага сэктару да пасеўнай кампаніі.

Газэта аб гэтым маўчыць. Газэта толькі заспакойвае сябе вясёлымі вершамі аб тым, што як

«... толькі сьнег з палёў зьгіне
у поле выйдзем мы тады...»

Вінаватых у раскраданьні хлеба—пад суд

Пастанова калегіі НК РСІ БССР

1. Канстатаваць, што праверкай, праведзенай групай камэрацыі і снабжэньня ЦКК-РСІ пры ўдзеле мэнскага гарсьвабу, выяўлены масавыя факты разбазарваньня і раскраданьня хлеба. Па 13 крамах за перыяд з 24 лютага 1932 году па 10 сакавіка 1932 году разбазарана і раскрадзена 35.693 кгр.

2. Справы аб краме № 64 МЦРК за нецахват 6.130 кгр, краме № 45 МЦРК—3.891 кгр., краме № 2 Белпрамхлеба — 2.249 кгр., ЗРК абутнікаў — 2.462 кгр., краме № 102 МЦРК — 4.998,7 кгр., краме № 96 МЦРК — 2.289,3 кгр., краме № 23 МЦРК — 2.220,4 кгр., краме № 6 Белпрамхлеба — 5.031 кгр., краме № 44 МЦРК — 2.188 кгр. — перадаць мэнскаму пракурору для прыкі, якая перакідаецца з месца на месца, з аднаго канца краіны ў другі, стачка паўтараная — стачка, якая паднімае адсталых да новага жыцьця барацьбой за эканамічныя палялішэньні — стачка, якая ілюміць і бічуе ўсякі выдатны акт гвалту, свавольля, самачынства царызму, стачка — дэманстрацыя, разгортваючая чырвоны сьцяг на вуліцах сталіц, нясучая рэвалюцыйныя прамовы і рэвалюцыйныя лёзунгі ў натоўп, у народную масу» (т. XII, ч. II, стар. 16).

У Польшчы злучэньне забастовак з дэманстрацыямі становіцца зьяўлішчам усё больш частым. Але слабі дэманстрацыі яшчэ ня масавыя, пераважна авангардныя. Партыя выводзіць на вуліцу толькі перадавыя атрады пралетарыяту. Выключэньне складаюць апошнія дэманстрацыі ў Верхняй Сілезіі.

Дасягнуты ў другой палове мінулага году ўзровень забастовачнага руху зьяўляецца, нясумненна, доказам паступовага пераходу значных рабочых мас у контр-наступленьне ня толькі на фронце эканамічнай але і палітычнай барацьбы. Скончэньне 80 проц. забастовак перамогай сьведчыць пагляднa аб рэвалюцыйным напружаньні сярод мас. Забастовачная барацьба ўсё мацней упарае па фашысцкім арбітражы, некалькі магутнаму, а цэлер банкрутуючаму перад масамі сродку наступленьня капіталу. Пад напорам гэтай барацьбы ўрад Пілсудзкага пакінуе тэрмінамі і скалай скарачэньня заработнай платы, праводзячы яе ў растэрміноўку тады, калі франтальная атака фабрыкантаў сустракаецца з баявой пазыцыяй мас, як гэта было ў Лодзі, у Дамброўскім рабіне і Верхняй Сілезіі. Пры правядзеньні наступленьня капіталу ўрад Пілсудзкага злучае арбітражныя манэўры з самымі шалёбным тэрорам.

Ю. ЛЕНСКІ

Чацьверты год крызісу ў Польшчы*)

II

Працяг пасьпяваньня прадпасылак рэвалюцыйнага крызісу ў Польшчы выяўляе значную яшчэ пяроўнамернасьць. Сыстэматычны аналіз аб'ектыўных прычын гэтай пяроўнамернасьці павінен быць зыходным пунктам пры вызначэньні тактыкі партыі. Мала канстатаваць факт, што рэвалюцыйны рух ідзе па ўзыходзячай лініі, бо гэта ня простая лінія, а з прыкметнымі зыгзагамі па паасобных вучастках рэвалюцыйнага фронту. Зьяўленьне гэтых зыгзагаў зьяўляецца пытаньнем пашырэньня масавага базісу руху, пытаньнем паступовага пераходу разгорнутым фронтам у контр-наступленьне, у атаку на фашысцкую дыктатуру і на ўвесь капіталістычны лад.

XI пленум ВККІ указаў, што ў Польшчы «прадпасылкі рэвалюцыйнага крызісу выяўляюцца: у абвастрэньні рэвалюцыйнай барацьбы ў горадзе і вёсцы (бурныя выступленьні беспрацоўных, барацьба супроць падаткоўых экзэкуцый, дарожных павінасьцяй і г. д.), у абвастрэньні барацьбы прыгнечаных народаў (Заходняя Украіна), у хваляваньні ў пізавых сацыял-фашысцкіх партый, ва ўсё большым зьмяваньні масавага базісу пілсудчыны і яе трансьмісій да мас (рост нездаволенья ўнутры фашысцкай «рабочай» партыі, сацыял-фашысцкай ППС і фашысцкага лягеру), а таксама ва ўзмацненьні камуністычнай партыі». Як выглядаюць зараз гэтыя фактары?

Асноўным найбольш характэрным для рэвалюцыйнага руху ў Польшчы зьяўляецца параўнаўча значны размах забастовачных баёў на рашаючым пралетарскім фронце. Яшчэ на XI пленуме ВККІ мы падкрэсьлівалі слабасьць забастовачнай барацьбы ў параўнаньні з шырокім рухам беспрацоўных і сялянскіх мас. Тагочасныя забастоўкі ахапляілі пераважна рабочых, занятых у дробнай і сярэдняй прамысловасьці. Забастовачны рух быў распылен. Процант пераможных забастовак быў нязначны. Гэтае становішча радыкальна зьмяняецца ў другім, асабліва ў трэцім — чацьвертым кварталах мінулага году. Забастовачны рух ахапляе буйныя фабрыкі і перакідваецца ў стратэгічна рашаючыя цэнтры працы. Забастоўкі ў вялізарнай свайёй большасьці канчаюцца перамогай. У радзе забастовак пралетарыят пераходзіць у контр-наступленьне, эмагаючыся ня толькі супроць зьніжэньня заработнай платы, але і за яе павышэньне. Нягледзячы на катастрафічны крысіс і беспрацоўе, забастоўка зьяўляецца пасьпяховай зброяй барацьбы супроць скарачэньняў і лёкаутаў.

Прыліў забастовачнай хвалі пачаўся ў першай палове мінулага году. На гэты пэрыяд — паводле афіцыяльнай статыстыкі — прыпадала 147 забастовак, ахапіўшых 317 прадпрыемстваў. Лік бастуючых складаў звыш 36 тысяч, лік-жа забастовачных дзён—182 тысячы. З агульнага ліку забастовак у першым квартале было 59 забастовак, ахапіўшых 188 прадпрыемстваў, 15 тысяч бастуючых і 72 тысячы забастовачных дзён, тады як у другім квартале — 88 забастовак у 130 прадпрыемствах, 21 тысяча бастуючых і 110 тысяч забастовачных дзён. І так, нават па вельмі ўрэзаных даных статыстычнай управы атрымліваецца агульны рост ліку забастовак, бастуючых і забастовачных дзён, а таксама — што самае важнае—узбуйненьне забастовачных баёў. З агульнага ліку 88 забастовак выйграных поўнасьцю або часткова было 58.

Вышэйшымі пунктамі напружаньня забастовачнай барацьбы ў першай палове мінулага году былі баявыя забастоўкі дамбровецкіх гарадзякоў і першая слаўная забастоўка варшаўскіх трамвайчыкаў. З гэтага часу забастовачная хваля разьліваецца ўсё шырэй, тармозячы шалёнае наступленьне капіталу, адбіваючы яго паасобныя атакі, пераходзячы на поўных вучастках у контр-атаку, ламаючы фашысцкі тэрор, які з дня ў дзень узмацняецца, і перакульваючы перашкоды, што высоўваюцца сацыял-фашызмам. Першы раз за цэлькі год мы маем надзвычай упартую, гераічную забастоўку цэлай галіны шаўковай вытворчасьці, забастоўку пяці тысяч рабочых, якая ахапляе 17 фабрык, апрача дробных майстэрань і цягнецца 16 тыдняў. Забастоўка лодзінскіх шоўкапрадзільшчыкаў адбывалася паперакор сацыял-фашысткім прафсаюзным бонцам, пад кіраўніцтвам прафсаюзнай левай. Рэвалюцыйны характар гэтай забастоўкі выявіўся, між іншым, у адхіленьні прапановы сацыял-фашыстаў звярнуцца за дапамогай у Амстэрдамскі Інтэрнацыянал. Пяцітысячная маса шоўкапрадзільшчыкаў пастанавіла звярнуцца за дапамогай у Прафінтэрн і выказала пратэст супроць палявых судоў. Гэта маса адхіліла таксама неадпаразовыя прапановы арбітражу. Забастоўка лодзінскіх шоўкапрадзільшчыкаў дасягнула высокага баявога напружаньня, дзякуючы злучэньню масавых мітынгаў з дэманстрацыямі. Гэта забастоўка разам з радам іншых забастовак у лодзінскай акрузе (забастоўка 4-х тысяч панчошнікаў, некалькі забастовак у Шлезэраўскай і Відзеўскай мануфактуры, забастоўка ў Азаркове, у Пабіяніцах і г. д.)—прывялі да буйнай забастоўкі 22-х тысяч лодзінскіх тэкстыльшчыкаў.

Ня меншае значэньне ў разьвіцьці рэвалюцыйнага руху мела другая лістападаўская забастоўка варшаўскіх трамвайчыкаў. Чатырохдзённая забастоўка шасьці тысяч трамвайчыкаў у самым цэнтры фашысцкай дыктатуры, у пэрыяд палявых судоў, пры скрытае нывбеніі, дала ня толькі гераічны адпор шалёнаму наступленьню капіталу, але зьяўлялася таксама прарывам у абвостранай сыстэме фашысцкага тэрору. Гэта забастоўка, перад якой адбывалася пасьпяховая верасьнёўская акцыя, рад мітынгаў і парад, — была больш грунтоўна падрыхтавана, чым ранейшая — чэрвенская забастоўка. Выведзеная на барацьбу прафсаюзная левай, паперакор усім рэакцыйным прафсаюзам, маса трамвайчыкаў аднагалосна адхіліла падпісаны гэтымі саюзамі арбітраж фашысцкіх улад. «Прафсаюзы анаэцыйных і ўрадавых сацыялістаў — скардзіўся «Варшаўскі вечар»—аказаліся бясьсільнымі. Масамі трамвайчыкаў аўладалі камуністы». «Усялякія рашэньні легальных саюзаў — канстатаваў «Кур'ер ілюстраваны»,—ня робяць ніякага ўплыву. Камандуюць камуністы». «Забастоўка якая ўзьнікла на эканамічнай глебе, падкрэсьліла ўрадавая «Газэта Польска»—перарадзілася ў акцыю ярка палітычнага і антыдзяржаўнага характару». Увесь буржуазны друк аднадушна адзначыў бясьсільле легальных (рэакцыйных) прафсаюзаў і поўнае кіраўніцтва камуністаў.

Тады прафсаюзныя бонцы зьмянілі сваю тактыку, фармальна далучыўшыся да забастоўкі, каб з сярэдзіны сарваць барацьбу. «Мы павінны падтрымаць забастоўку — гаварылі паны з ППС,—бо камуністы маглі-б нас пазбавіць усякага ўплыву на масу трамвайчыкаў» («Кур'ер паранны»).

Лістападаўская забастоўка варшаўскіх трамвайчыкаў адбывалася на больш шырокім базісе, чым чэрвенская забастоўка. Яна была падтрымана забастоўкамі салідарнасьці некалькіх тысяч яўрэйскіх і польскох рабочых. Лістападаўская забастоўка была першым крокам на шляху рэалізацыі ўсеагульнай забастоўкі ў Варшаве. Гэта была сапраўды масавая рэвалюцыйная забастоўка па баявой актыўнасьці мас, якія нясупынна змагаліся на вуліцы супроць узброеных з ног да галавы атрадаў паліцыі і жандармэрыі, скідвалі штрэйкбрэхераў і тры разы зьнімалі з вуліц Варшавы курсуючыя трамваі. Той факт, што другая забастоўка варшаўскіх трамвайчыкаў толькі часткова адбіла атаку на зарплату, а таксама выкрыла сур'ёзныя памылкі і недахопы, якія былі аспоўна раскрытыкаваны, не выключае яе рэвалюцыйнага значэньня.

Пасьля забастоўкі варшаўскіх трамвайчыкаў выбухнула забастоўка лодзінскіх трамвайчыкаў. З гераічнай упартасьцю лодзінскія трамвайчыкі адхілілі ультыматум дырэкцыі, заханалі згуртаваны фронт барацьбы (адсутнасьць штрэйкбрэхераў) і пашырылі яго на дэпо і майстэрні. Па сваёй працяжнасьці, выключнай згуртаванасьці лодзінская забастоўка перавысіла абедзьве варшаўскія забастоўкі. Сумесны фронт лодзінскіх тэкстыльшчыкаў і трамвайчыкаў, ахапляючы усё новыя атрады рабочых, пачаў перарастаць у рапэтыцыю ўсеагульнай забастоўкі ў Лодзі.

Сур'ёзнае значэньне мелі дэманстрацыйныя забастоўкі чыгуначнікаў у Вільні і ва Львове, якія сьведчаць аб настроях барацьбы сярод мас чыгуначнікаў, якія закоўваюцца ўрадам Пілсудзкага ў кайданы мілітарызацыі. Гэтыя настрої выразна правяліся ўжо на жнівеньскім зьезьдзе прафсаюзу чыгуначнікаў, які выявіў высокую ступень рацыяналізацыі мас чыгуначнікаў. Прасякненьне на зьезд, наперакор сумесным намаганьням паліцыі і прафбюракратыі, фактычнай большасьці левых дэлегатаў зьяўляецца сымптомам пасьляваньня баёў на адным з рашаючых вучасткаў пралетарскага фронту. Фашысцкі ўрад, навучаны вопытам усеагульных забастовак чыгуначнікаў у 1921 і 1923 годзе, прабуе загадзя мілітарызаваць масы чыгуначнікаў, навязваючы ім усё горшыя ўмовы працы.

Забастовачная барацьба гарадзкога пралетарыяту ўскалыхнула шматтысячныя масы сельска - гаспадарчых рабочых, бастуючых супроць зьніжэньня і затрыманьня заработнай платы. Забастовачны рух ахапіў рад мясцовасьцяй у цэнтральных і заходніх ваяводзтвах, выклікаючы трывогу сярод памешчыкаў.

Армія бастуючых рабочых гарадоў і вёсак нясупынна ўзрастае. Лік бастуючых у 1931 годзе дасягнуў, на ўсёй відавочнасьці, двухсот тысяч. Агульны размах забастовачнай барацьбы пралетарыяту ўяўляе ў яе таксама звычайна насыпныя пласты працоўнай інтэлігенцыі. У гэтых адносінах вельмі характэрна трохдзённая італьянская забастоўка муніцыпальных служачых у Варшаве. На шмях забастовачнай барацьбы пастанаўляюць устучыць дзесяткі тысяч дзяжурных служачых. Дэманструюць на вуліцы і асаджаюць гарадзкую думу тэатральныя работнікі, пратэстуюць і пагражаюць забастоўкай пастаўшчыкі гарадзкіх школ.

Масавая пралетарская забастоўка ў Польшчы пазьнала зьмяшчэньне агульна - рэвалюцыянізуючую ролю, становячыся вагаром рэвалюцыйнага руху ва ўсёй краіне. Забастоўка, як зброя барацьбы, становіцца выражэньнем і зброяй гегемоніі пралетарыяту, яго кіруючай ролі ў барацьбе мільённых працоўных мас, баявога саюзу з мільёнными масамі эксплёатаванага сялянства і прыгнечаных народаў. Забастоўка — гэта сэгэльфічна пралетарская зброя — становіцца, гаворачы словамі Леніна «галоўным сродкам раскачваньня мас і найбольш характэрным зьявішчам у хваляпадобным нарастаньні рашаючых падзей». Пераможная забастоўкі рабочых штурхаюць масы на барацьбу ў найбольш глухіх кутках краіны. «Шырокія масы эксплёатаваных — гаворыць Ленін аб рэвалюцыі 1905 году — пельга было-б ніякім чынам ушагнуць у рэвалюцыйны рух, калі-б гэтыя масы ня бачылі перад сабой прыкладаў, як наёмныя рабочыя розных галін прамысловасьці прымушалі капіталістаў да непасрэднага, неадкладнага палялішэньня свайго становішча». «

УЗЬНЯЦЬ ЯШЧЭ ВЫШЭЙ РОЛЮ ПРАФСАЮЗАЎ У БАРАЦЬБЕ ЗА ГЕНЭРАЛЬНУЮ ЛІНІЮ ПАРТЫІ

6 УМОЎ тав. СТАЛІНА—АСНОВА АСНОЎ РАБОТЫ ПРАФАРГАНІЗАЦЫЙ ПА АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНІ ПЯЦІГОДКІ ЗА ЧАТЫРЫ ГАДЫ, ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ДРУГОГА ПЯЦІГОДЗЬДЗЯ

ПАЛЯПШЭНЬНЕ МАТАР'ЯЛЬНА-БЫТАВЫХ УМОЎ РАБОЧЫХ—ВАЖНЕЙШЫ ВУЧАСТАК ПРАФСАЮЗНАЙ РАБОТЫ

Паляпшэньне матар'яльна - бытавых умоў рабочае клясы — сустаўная частка барацьбы за прамфінплян. Гэта галіна работы па праве павінна займаць адно з важнейшых месц у дзейнасьці прафсаюзных арганізацый. У нашым распарадкэньні ёсьць вялізарныя магчымасьці, магутныя ваг гары для сыстэматычнага паляпшэньня матар'яльна - бытавых умоў рабочых і працоўных мас.

Пастаўць гэтыя вагары цалкам на службу барацьбе за прамфінплян, за сыстэматычнае павышэньне рэальнай заработнай платы, выкарыстаць нашы магчымасьці з найбольшай эфэктыўнасьцю для росту рабочага дабрабыту—такава адна з галоўных задач барацьбы за сацыялізм.

Партыйныя зьезды, цэнтральны кампітэты ў гэтым напрамку далі вычарпальныя дырэктывы і ўказаньні. Прафсаюзы павінны штодзенна ажыцьцяўляць гэтыя ўказаньні, ператвараючы дырэктывы нашай партыі ў практыку на розных вучастках работы, на кожным прадпрыемстве.

У галіне работ чацьвертага заключнага году пяцігодкі вялікае месца адведзена будаўніцтву сацыяльна - бытавых устаноў, адпушчаны значныя сумы на сацыяльна-бытавое жыльлёва - камунальнае будаўніцтва, ахову працы, на паляпшэньне рабочага снабжэньня.

У 1931 г. у камунальнае будаўніцтва ўкладзена 16.845 тыс. руб., у жыльлёвае — 6.638 тыс. руб., а ў 1932 г. будзе ўкладзена ў камунальнае будаўніцтва 26.138 тыс. руб. і ў жыльлёвае будаўніцтва — 25.250 тыс. руб.

Завяршэньне 1931 гаспадарчага году адзначана значнымі посьпехамі па сацыяльна - бытавым абслугоўваньні рабочых і працоўных мас.

Агульны лічбаў: у 1930 г. палічвалася застрахаваных 288.400 чал., у 1931 г. — 427.200 чал.

Узрасло абслугоўваньне рабочых дамамі адпачынку, санаторыямі, курортамі і мэдапамогай. Калі ў 1930 г. праз дамы адпачынку было прапушчана 10.000 чал., то ў 1931 г. — 147.050 чал., праз санаторыі адведана 1.400 і 1.700, праз курорты — 880 чал. і 1.380 чал. Мэдапамога ўзрасла з 5.115 тыс. руб. у 1930 г. да 9.416 тыс. руб. у 1931 г.

Адпушчаныя звыш мільёна рублёў на арганізацыю дзіцячых яслянь, садоў, школьнае харчаваньне, малочныя кухні і інш. забясьпечылі рост гэтых устаноў і значна спрылі замацаваньню жаночых кадраў, занятых у прамысловасьці.

Адпак, асычаваныя сродкі не заўсёды выкарыстоўваліся рацыянальна і поўнасьцю. Паўная магчымасьці для разгортваньня бытавых устаноў і паогул для сацыяльна - бытавога абслугоўваньня рабочых куды вышэйшыя, чуды большыя за тое, што дасягнута.

Гэтыя магчымасьці палёка пявыкарыстаны. Не пастаўлена як сьлед работа па вышчаньні ўнутраных рэсурсаў, па мабілізацыі сродкаў саюзнай масы. Тут з усёй сілай выявілася слабасьць масавай арганізатарскай работы прафсаюзаў.

Прафарганізацыі ў большасьці займаліся разьмеркаваньнем таго, што ад шчодрана бюджэтам, не праяўляючы ў патрэбнай меры сваёй уласнай ініцыятывы. Больш таго. Нават тыя сродкі (прызначаныя для паляпшэньня бытавых умоў рабочых), якія знаходзіліся непасрэдна ў прафарганізацый, як правіла, не выкарыстоўваліся.

Мы маем на ўвазе фонд паляпшэньня быту рабочых, які па тарыфнай прамысловасьці непавыканан на 410 тыс. руб., па мэталапрацоўчай — на 176 тыс. руб., па прамысловасьці будматар'ялаў — на 30.000 руб. і г. д. Гэта між іншым характарызуе крайнюю слабасьць работы прафсаюзных арганізацый па сацыяльна - бытавым абслугоўваньні рабочых такіх галін прамысловасьці, як торфяная, дзе непадвыконваецца прамфінплян, дзе асабліва вялікая цякучасьць рабочай сілы.

У агульным ланцугу мерапрыемстваў, накіраваных на паляпшэньне матар'яльна - бытавых умоў рабочай клясы, найбольш значнае месца займае рабочае снабжэньне. Пасьля VI зьезду прафсаюзаў работа прафарганізацый па гэтым вучастку адзначана поўным арухам, набліжэньнем нізавых ячэек да вырашэньня канкрэтных пытаньняў работы каапэрацыйна - гандлёвай сеткі.

Гэта знайшло сваё адлюстраваньне ў практычным узьеле прафарганізацый за ўстанаўленьні дыфэрэнцыяванага снабжэньня, стварэньні «фонду ўдарніка», арганізацыі ЗРК і г. д.

Тут бясспрэчна праведзена вялікая работа. Асобныя ЗРК пры актыўнай дапамозе фабрычна - заводзкіх камітэтаў («Палесдрук», «мэталіст», ТСТ чыгуначнікаў — Гомель) на аснове разгортваньня культурнага савецкага гандлю, на аснове самазагатовак дабіліся значнага перавыкананьня пляновых норм забясьпячэньня рабочых асноўнымі прадуктамі харчаваньня.

Але было-б няправільным захапляцца першымі посьпехамі і не бачыць буйных прабелаў і недахопаў у работе каапэрацыйнай і ўсёй гандлёвай сеткі.

Прафсаюзныя арганізацыі прымаюць вусім цвыстарчальны ўдзел у разгортваньні самазагатовак і па - заплянавых закупках каапэрацыйна-гандлёвай сеткай і, у прыватнасьці, ЗРК. Праведзены нядаўна ЦКК КП(б)Б агляд работы 11 ЗРК і 2 ПРБ у галіне разгортваньня цэнтралізаваных закупак, выявіў цэлы рад недахопаў і грубых скажэньняў прыцыпаў савецкага гандлю.

Пры паўнасьці павялічэньня ўдзельнай вагі па - заплянавых закупак у агульным таваразвароце, апошнія ідуць у большасьці сваёй за кошт перакупак ад дзяржаўных і каапэрацыйна - гандлёвых арганізацый і зусім у мізэрнай колькасьці ад непасрэдных вытворцаў. Прычым, сельска - гаспадарчыя прадукты ў самазагатоўчых апэрацыях займаюць пазначнае месца (па ЗРК «Сельмаш» — 17 проц., «Кам інтэрн» — 11 проц., «Чырвоны мэталіст» — 14,3 проц. і г. д.).

У практыцы самазагатоўчай работы асобных ЗРК знайшлі сваё праяўленьне «пэйзанскі дух» (разбазариваньне, спэкуляцыя востра - дэфіцытнымі таварамі), таваразьмяненьня апэрацыі, дубліраваньне таваразвароту і іншага парадку скажэньні прыцыпаў савецкага гандлю. Зразумела, што ўсё гэта балюча б'е па рабочым снабжэньні.

Слабасьць практычнага ўдзелу прафарганізацый у рабоце каапэрацыі, невыстарчальная дапамога цэлага раду фабзаўкомаў закрытым рабочым каапэратывам тут вырысоўваецца са ўсёй паўнатой.

Нельга бясспрэчна адмаўляць таго факту, што пытаньні работага забясьпячэньня зараз займаюць куды большае месца ў дзейнасьці прафарганізацый, чым калі-б там ні было. Але бяда ў тым, што гэта носіць у большасьці кампанейскі характар, што аб работе каапэрацыі больш гутарак (і гутарак нярэдка беспрадметных), трасканні, чым дапамогі і сапраўднай мабілізацыі рабочых мас вакол канкрэтных задач.

Гэта адносіцца ў першую чаргу да пытаньняў арганізацыі рабочага кантролю зьнізу. Разуменьне сутнасьці рабочага кантролю зьнізу і практычная работа ў гэтым напрамку нярэдка зводзіцца да райдаў, налётаў і толькі. Між тым практыка работы пасобных прадпрыемстваў паказала, што іменна штодзенны кантроль, які спалучаецца з канкрэтнай дапамогай, дае бліскучыя вынікі ў перабудове работы каапэрацыйнага апарату ў паляпшэньні рабочага снабжэньня. Па гэтым шляху патрэбна накіроўваць работу на кожным прадпрыемстве, у кожным ЗРК.

Прэзыдыум ЦСПСБ у сваёй пастанове аб рабоце сталоўкі фабрыкі імя Клары Цэткін (Віцебск) канстатаваў, што ў «пытаньні перабудовы грамадзкага харчаваньня няма належнага пералому». Колькасное пашырэньне сеткі сталовак (ахоплена 73,5 проц. рабочых) усё-ж не здавальняе вырасшых патрэб. Эфэктыўнасьць росту сеткі значна памяншаецца дрэннай арганізацыяй, нізкай якасьцю работы большасьці рабочых сталовак.

Вопыт перабудовы работы лепшых рабочых сталовак ня стаў яшчэ здабытакам усёй сыстэмы грамадзкага харчаваньня і ў гэтым не малая віна заводзкіх прафарганізацый, у рабоце якіх яшчэ жывуць традыцыі адмахованьня ад работы сталоўкі, як ад «другараднай справы».

У справе паляпшэньня матар'яльна - бытавых умоў рабочай клясы і, у прыватнасьці, у галіне рабочага снабжэньня прадстаіць вялікая работа. Партыяй пастаўлена гэта задача ў разрад першаступенных.

Пытаньням рабочага снабжэньня адведзена вялікае месца ў рабоце VII зьезду прафсаюзаў БССР. Нясумненна, што рэалізацыя пастаноў гэтага зьезду пры максымальнай мабілізацыі ўвагі і сіл членаў прафсаюзаў і ўсёй савецкай грамадзкасьці забясьпечаць далейшыя посьпехі па гэтым важнейшым вучастку.

В. САМУЦІН.

Чырвоны сьцяг у надзейных руках

Вось ужо на працягу двух год калектыў «Бальшавіка», пад кіраўніцтвам сваёй партарганізацыі і заўкому, ідзе ў першых калёнах барацьбітоў за прамфінплян.

У чым сакрэт перамогі? У нерабудове кіраўніцтва па-новаму.

Партыйная і прафэсыянальная работа перанесены ў нізавыя зьвяны — цэхі і брыгады.

23 брыгады працуюць на гасхадарчым разрахунку.

Трыкутнікі брыгад апэрацыйна кіруюць барацьбой іх за выкананьне праграмы. Лепшыя брыгады, пылхам абмену штодзенкамі, перадаюць свой вопыт работы тым, якія адстаюць. Часта практыкуецца і такі мэтад перадачы вопыту, як пасылка буксірных груп у адсталыя брыгады. На вытворчай нарадзе рамічыкаў першага хромавага надаўна ішла гутарка аб непаладках у рамічыкаў 2-га хромавага. Рамічыкі 1-га хромавага давалі 110 рам у дзень, рамічыкі 2-га — калі 80. Ударніца тав. **Дубінская** прапанавала пасланць брыгаду на 5 дзён на работу ў 2-гі хромавы. Прапанова была прынята. Брыгада з 4-х чалавек на другі дзень ужо працавала ў рамічыкаў 2-га хромавага цэху. На пяты дзень апошнія далі 100 рам, потым 105-112 і г. д.

Заўком тры разы ў месяц склікае нарады старшынь цэхавых прафкамітэтаў і інструктуе іх. Цэхавыя прафарганізацыі ў сваю чаргу склікаюць штомесячныя нарады брыгадных прафоргаў. На гэтых нарадах па выходзяць з парадку дня пытаньні ажыцьцяўленьня 6 умоў тав. Сталіна.

Адзін раз у месяц склікаецца агульназаводская канфэрэнцыя для падагуленьня выніка́ў работы за месяц. На гэтых канфэрэнцыях лепшыя брыгады знаёмяць іншых з вопытам сваёй работы.

З месяца ў месяц чырвонасьцяжны «Бальшавік» перавыконвае прамфінплян. У студзені вытворчая праграма выканана на 101,25 проц. у колькасным азначэньні і на 105,4 проц. у цэнасным. У лютым адпаведна—на 104,5 і 108,43 проц. Першая дэкада сакавіка дае наступныя паказальнікі: праграма выканана ў колькасным азначэньні на 104,16, у цэнасным — на 116,5 проц. Апошні паказальнік характарызуе рашучую барацьбу партыйнай і прафарганізацыі заводу за зьніжэньне сабекошту, за якасьць прадукцыі.

Як кіруе прафработай на заводзе цэнтральнае праўленьне саюзу гарбароў? На гэта пытаньне работнікі заўкому адказваюць:

— У большасьці выпадкаў—цыркулярна.

А. М.

Лічбы галасуюць за гаспадарчы разрахунак

У выніку працадоўкі на цэхах і брыгадах адозвы ўсеЦСПС і ВСНГ СССР аб гаспадарча-разрахунковых брыгадах, як вышэйшай форме сацспаборніцтва, **па друкарні імя Сталіна** перайшлі на гаспадарчы разрахунак у 1931 г. тры брыгады, з 1 студзеня яшчэ тры, а ў лютым, у часе падрыхтоўкі да заключэньня новых калдагавораў, — дзвае брыгады.

Такім чынам, друкарня імя Сталіна да 7 зьезду прафсаюзаў Беларусі прыходзіць з паўнасьцю 8 гаспадарча-разрахунковых брыгад, якія ахопліваюць 108 рабочых.

Ужо зараз можна падвесьці некаторыя вынікі работы гаспадарча-разрахунковых брыгад. Усе брыгады, за выключэньнем камсамольскай - (паборны цэх) за апошнія месяцы перавыканалі свой прамфінплян.

Асаблівай увагі заслугоўвае брыгада імя **Молатава** (паборны цэх). Склад брыгады 9 чалавек. Прамфінплян у студзені выканан брыгадай на 107,9 проц., плян росту прадукцыйнасьці працы паборшчыкаў — на 112,1 проц., прагулы і спазьненьні ліквідаваны; брак зьніжан. У выніку брыгада з'эканоміла 198 руб., а сабекошт набору тысячы літараў зьнізан на 9 кап.

Брыгада імя XIII гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі з'эканоміла за адзін месяц 125 руб. і зьнізіла сабекошт тысячы літараў на 5,5 кап., брыгада імя XVI зьезду ўсеКП(б) з'эканоміла 130 руб. і зьнізіла сабекошт на 2,5 кап. на тысячу адбіткаў.

Фабрычна-заводзкі камітэт аддаваў шмат увагі пытаньням гаспадарчага разрахунку. Асноўны ня жар прафсаюзнай работы перанесен у нізавыя зьвяны. Прафорг штодзенна склікаюць нарады брыгад, на якіх ставяць канкрэтныя пытаньні (выкананьне прамфінпляну, паляпшэньне якасьці прадукцыі, працоўная дысцыпліна і інш.).

Адпак, трэба адзначыць, што фабком да апошняга часу не арганізаваў пырокага абмену вопытам перадавых брыгад, работа якіх зьяўляецца крыніцай унутрыпрамысловага пакаленьня, важнейшым фактарам выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну.

Зараз фабрычна-заводзкім камітэтам і рэдкалегіяй газэты («Друкарская праўда») абвешчан конкурс на лепшую гаспадарча-разрахунковую брыгаду.

Палярны.

Брыгада т. Снабловай лепшая на фабрыцы імя К. Цэткін

ВІЦЕБСК. На ФАБРЫЦЫ ІМЯ КЛАРЫ ЦЭТКІН налічваецца 60 гаспадарча-разрахунковых брыгад. Нядаўна на фабрыцы праводзіўся конкурс на лепшую гаспадарча-разрахунковую брыгаду. Конкурс прайшоў пры вельмі вялікім узьеле вытворчага энтузіязму рабочых-ударнікаў. Разгарнулася шырокая спаборніцтва на выкананьне сустрэчных плянаў, на хутчэйшую рэалізацыю 6 умоў, на ўвядзеньне зьменна - сустрэчнага плянаваньня. Лепшымі аказаліся брыгады СКАБЛОВАЙ, ШАЎРЫНАЙ, АФОНІНАЙ, ЦЫПЕРСОН і ЛІСБАНАВАЙ.

Брыгада тав. СКАБЛОВАЙ за час з 10 па 20 лютага выканала 115,3 проц. заданьня і з'эканоміла 142 голкі.

ЭПШТЭЙН.

Сотні новых рацыяналізатарскіх прапаноў у фонд зьезду прафсаюзаў

БЮРО РАБОЧЫХ ВЫНАХОДЦАЎ **ВІЦЕБСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАЙ АКУЛЯРНАЙ ФАБРЫКІ** прыняло выклік заводу «Бальшавік» аб уключэньні ў падрыхтоўку да VII

Тав. РАМАНАЎ П. — старшыня заўкому гомельскага заводу «Пралетары», што выканаў пяцігодку ў 3 гады 3 месяцы.

УСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЕЗДУ ПРАФСАЮЗАЎ. САБРАНА 50 РАЦЫЯНАЛІЗАТАРСКІХ ПРАПАНОЎ, ЯКІЯ ДАЮЦЬ ЭКАНОМІЮ 9.700 РУБ.

УНЕСЕНА ПРАПАНОВА АБ ПАЛЯПШЭНЬНІ ЯКАСЬЦІ ШКЛА, ЯКАЯ ДАЕ ЭКАНОМІ 460 ТЫС. РУБ. У ГОД. **ВЫНАХОДЦЫ ФАБРЫКІ АБГАВАРЫЛІ ЗАЯЎКУ НА ІМПАРТ І СКАРАЦІЛІ ЯЕ З 10 ТЫС. РУБ. ДА 1,150 РУБ.**

ДА VII ЗЬЕЗДУ ПРАФСАЮЗАЎ ПЛЯН РАЦЫЯНАЛІЗАТАРСКІХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ ПЕРШАГА КВАРТАЛУ 1932 Г. ВЫКАНАН НА 96 ПРОЦ.

***

ІТР І ВЫНАХОДЦЫ ГУТЫ «ПРАЛЕТАРЫ» (МЕНСК) УКЛЮЧЫЛІСЯ Ў КАМПАНІЮ ЗВОРУ РАЦЫЯНАЛІЗАТАРСКІХ ПРАПАНОЎ У ФОНД VII УСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЕЗДУ ПРАФСАЮЗАЎ. УЖО УНЕСЕНА Ў ФОНД АД ІТР 18 ПРАПАНОЎ, АД РАБОЧЫХ —15 З АГУЛЬНЫМ ЭКАНАМІЧНЫМ ЭФЭКТАМ У 6.400 РУБ. ІТР І ВЫНАХОДЦЫ АБАВЯЗАЛІСЯ ЗЬНІЗІЦЬ САБЕКОШТ ПРАДУКЦЫІ ЗА ГОД НЯ МЕНШ, ЯК НА 2 ПРОЦ. ЗА КОШТ РАБОЧЫХ РАЦЫЯНАЛІЗАТАРСКІХ ПРАПАНОЎ.

***

РАБОЧЫЯ **БАБРУЙСКАГА МАШЫНАБУДАЎНІЧАГА ЗАВОДУ ІМЯ СТАЛІНА** АБАВЯЗАЛІСЯ ДА VII УСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЕЗДУ ПРАФСАЮЗАЎ ДАЦЬ У ФОНД ЗЬЕЗДУ НЯ МЕНШ 50 РАЦЫЯНАЛІЗАТАРСКІХ ПРАПАНОЎ; АДКРЫЦЬ НОВЫ ЛЕНІНСКІ КУТОК; НЕ ПАЗЬНЕЙ І КРАСАВІКА ПРЫСТУПІЦЬ ДА ПАБУДОВЫ НОВАЙ СТАЛОЎКІ; ДАВЕСЬЦІ БРАК ПРАДУКЦЫІ ДА МІНІМУМУ.

Якасьць прадукцыі--на першае месца

БАРЫСАЎ. Прафсаюзы Барысаўшчыны ашчэ ня сталі на чале барацьбы рабочых мас за якасьць работы. У 1931 годзе ні адно прадпрыемства Барысава ня выканала якасных паказальнікаў. Справа не палепшылася і ў гэтым годзе.

Кіраўніцтва запалкавай фабрыкі **«Пралетарская перамога»** вельмі часта атрымлівае з розных куткоў Савецкага Саюзу лісты са скаргамі на дрэнную якасьць запалак: няпоўныя скрынкі, недамочаныя галоўкі запалак, касыя направільна наклееныя этыкеты.

Але гэтыя лісты, якія павінны былі паслужыць зброяй барацьбы за якасьць прадукцыі, не даводзяцца да рабочых фабрыкі. Грамадзкая думка вакол браку ня ўзьнята.

Нездавальняючыя якасныя паказальнікі дае **папяровая фабрыка «Прафінтэрн».** Папера, якая ёю выробляецца, мае 50 проц. вільготнасьці. Ёсьць шмат фактаў адмаўленьня спажыўцоў ад прыёмкі такой паперы; за апошні час брак на фабрыцы дасягнуў 4,8 проц.; страты штодзенна перавышаюць 650 руб.

Сыстэма зарплаты на прадпрыемствах не перабудавана ў напрамку стымуляваньня лепшай работы — улічваюцца толькі колькасныя паказальнікі; не заахвочваецца зацікаўленасьць рабочых у выпуску добраякаснай прадукцыі. Калі ў мінулым годзе на прадпрыемствах арганізоўваліся грамадзкія суды над бракарабамі, вынтаўкі браку, дык зараз прафарганізацыі праяўляюць вельмі слабую ініцыятыву ў гэтай справе.

Якасьць работы зьяўляецца асноўным зьвяном вытворчай работы ў 1932 г. Прафсаюзы Барысаўшчыны павінны пакласьці ўзяцца за выкананьне гэтай важнейшай і адказнейшай задачы.

П. П. Н.

Цэхавыя камітэты „Дзьвіны“ слаба змагаюцца з цякучасьцю рабочай сілы

ВІЦЕБСК. За апошні час партыйная і прафэсыянальная арганізацыі **ільнапрадзільнай фабрыкі «Дзьвіна»** правялі значную работу па ліквідацыі ўрэшпілаўкі ў зарплаце. Аплата ватэрнічыц па вагавым прынцыпе ўзьняла прадукцыйнасьць працы і заработак; калі раней усе ватэрнічыцы атрымлівалі зарплату, выходзячы з іх агульнай выпрацоўкі, дык зараз аплата працы робіцца згодна выпрацоўкі кожнай з іх.

Работніцы прымацаваны да машын, за якія яны нясуць адказнасьць. Таксама зьніжана абязьлічка ў нагляде за інструментамі і прыладамі. Значна горш стаіць справа з увядзеньнем **функцыянальнай сыстэмы.** Да гэтага часу на функцыянальную сыстэму пераключана толькі 10 варштатаў, ня гледзячы на тое, што гэта сыстэма дае станоўчыя вынікі: машыны № 59, 60, 61, замест нормы ў 29 кгр. пражы, даюць ад 32 да 38. Прафэсыянальныя арганізацыі не правялі шырокай фастлумачальнай работы па пытаньні ўкараненьня функцыянальнай сыстэмы.

Ільнапрадзільная фабрыка «Дзьвіна» выканала студзеньскі плян на 42 проц., лютаўскі — на 66,5 проц. Прычыны адставаньня — у вытворчых непаладках, якія маюць месца ў радзе цэхаў і агрэгатаў. Самым вузкім месцам на фабрыцы зьяўляюцца загатоўчыя цэхі (істужкавыя, банка-брошныя і карда-машыны). Непаладкі ў гэтых цэхах зрываюць работу ватэрнага і мятальнага цэхаў. Несвачасовая падача поўфабрыкатаў з загатоўчых цэхаў уваішла ў сыстэму. За адзін толькі люты ватэрныя цэхі выключна з прычыны несвачасовай падачы поўфабрыкатаў мелі прастою кала 130.000 вераён-гадзін. У загатоўчых цэхах наглядаюцца частыя прастоі машын з-за несвачасовай і дрэннай спыўкі выкаваных пасаў.

Нельга прайсьці міма таго факту, што 21-шы банка-брош стаіць 6 месяцаў без работы толькі таму, што фабрычныя арганізацыі не прынялі мер, каб завод «Камінтэрн» выканаў заказ на адліўку пасьцідронак.

Рабочыя слаба мабілізаваны на барацьбу за якасьць прадукцыі. За апошні час сталі вельмі частымі выпадкі паступленьня з матальнага цэху ў сушыльку пражы з вялікімі недамоткамі. Так, 8-га сакавіка ў двух зьмёнах пражы было недаматана 4.800 нітак.

Фабрыка за апошні час атрымала рад скаргаў спажыўцоў, што ў атрымалай прадукцыі ёсьць пража з пяроўнамернай ніткай, са многімі недамоткамі і перамоткамі.

Ня зьмята цякучасьць рабочай сілы. За студзень і люты прыбылі 259 і выбылі 152 рабочых. Значна перапаўняюць выкананьню праграмы прагулы. За адзін толькі люты налічваецца 440 прагульных чалавека-дзён. З прычыны павыхаду рабочых на работу ватэрныя цэхі мелі ў лютым 241.386 вераён-гадзін простою.

Прафарганізацыі «Дзьвіны» бяз увагі адносьліся да пытаньня барацьбы з прагуламі і не ўзьнялі грамадзкай думкі вакол гэтай справы.

Арганізацыі фабрыкі фармальна адносьліся да стварэньня гаспадарча-разрахунковых брыгад. На фабрыцы налічваецца 49 гаспадарча-разрахунковых брыгад, але аб эфэктыўнасьці іх работы ніхто ня ведае.

За апошні час дзякуючы наблізжэньню кіраўніцтва да цэху, крывая выкананьня прамфінпляну пайшла ўгару. Першая пяцідзёнка сакавіка дала 94,5 проц. праграмы. Задача фабрычных арганізацый — узьняць актыўнасьць і творчы ўздым рабочых мас на поўнае выкананьне прамфінпляну, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на якасьць прадукцыі.

БРЫГАДА «ЗЬВЯЗДЫ»:
Баравы, Сквернякоў і
Арк. Зарубежны.

Кіраўніцтва нізавымі зьвяньнямі--адсталы вучастак работы

БАРЫСАЎ. (Наш кар.). Закрыўся другі зьезд прафсаюзаў Барысаўшчыны. Асноўнымі пытаньнямі зьезду былі справаздачныя даклады ЦСПСБ, райпрафсавету, даклады аб выкананьні прамфінпляну, аб рабоце страхкасы і становішчы прыгарадных гаспадарак. Па дакладах разгарнуліся вельмі жывыя спрэчкі, у якіх дэлегаты зьезду крытыкавалі пасобныя прабелы і недахопы, дапушчаныя ў прафсаюзнай рабоце. Выступаўшыя адзначалі, што многія ЦП саюзаў яшчэ **не наладзілі жывога кіраўніцтва работай ФЗМК.** Узмацненьне кіраўніцтва нізавымі зьвяньнямі застаецца важнейшай задачай прафэсыянальных арганізацый. Камбінат «Камінтэрн», на якім працуе 1.400 рабочых, даготуляя мае свайго клюбу, было вынесена некалькі пастаноў аб пабудове клюбу, але яны застаюцца ў справах ПП. Цэнтральныя праўленьні мала дапамагаюць фабзаўкомам у правядзеньні калдагаворнай кампаніі.

Зьезд прайшоў пад знакам мабілізацыі рабочых мас Барысаўшчыны на выкананьне балёвых задач чацьвертага заключнага году пяцігодкі.

Н.

Праўдзін

Шлях да перамогі

Гэта было яшчэ ў тыя дні, калі 1-ую **Белдрэс імя Сталіна** трэсла, як хворага на малярыю. Гадзіны пармальнай работы зьмяняліся ледзь дрыжэтным біцьцём пульсу. Стрэлка манометра, падпарадкоўваючыся ціску пары ў катлох, то апускала ўзьнімалася ўгару, то імкліва падала ўніз. На галоўным шчыце порыцы (на вымяральнай прыладзе) пераваліся—расьлі і перасоўваліся ўлева, сыгналізуючы аб перагрузцы турбагенэратара. Разам з порыцамі пераваліся дзяжурны ля шчыта, дзяжурны інжынэр, качагары, турбінныя майстры і ўсе іншыя гэтай зямены.

— Алё! Віцебск! Падрыхтуйце да разгрузкі кілёват 500...

— Алё! Ворша! Падрыхтуйце 300 кілёват...

Гэта дзяжурны ля шчыта папярэджвў станцыі — быць гатовымі выключыць частку спажыўцоў.

Паменшаная нагрузка варочала пэрыядам на кароткі час спакой. Супакойваўся і дзяжурны ля шчыта. За 8 месяцаў сыстэматычных перабояў і разгрузак порсанал станцыі прывык, як прывыкаюць да хранічнага хворага.

Толькі энтузіясты - качагары бегалі ад катла да катла, ад топкі да топкі. Здавалася, што ўся энэргія, алабраная ад фабрык і заводаў, пераходзіла ў гэтыя хударлявыя, мускулістыя цэлы і асьвятляла гэтыя мужныя, закопчаныя твары.

У вогненай пастцы топак зьнічалі цэлыя штабэлі паколаных дроў. Жывы канвэер без перадышкі сыпаў у жаменныя рукавы коўшы каменнага вугалю. Нафтавыя форсункі крычалі поўным голасам, бязупынна ўпырскваючы сухотнаму полымю цэсяткі тон шмат каёрыйнай нафты. Доўгія жалезныя штанги, ізаляваныя мускулістымі рукамі ўкрыццяў пугаравалі вогненую

Для гэтага патрабуецца, далей, каб нашы гаспадарчыя кіраўнікі кіравалі прадпрыемствамі не «наогул», не «з паветра», а канкрэтна, прадметна, каб яны падыходзілі да кожнага пытаньня ня з пункту погляду агульнай балбатні, а строга дзелавым чынам, каб яны не абмяжоўваліся папяровай адпіскай, або агульнымі фразамі і лёзунгамі, а ўзыходзілі ў тэхніку справы, углыбляліся ў дэталі справы, углыбляліся ў «дробязі», бо з «дробязяй» будуюцца вялікія справы».

Партыйнае, гаспадарчае і прафсаюзнае кіраўніцтва 1-ай Белдрэс не спыпчула ўвагі на гэту мудрую параду правадыра партыі і рабочай клясы. Яно ня вывучыла канкрэтна новых умоў разьвіцьця прамысловасьці, яно не ўвайшло ў тэхніку сваёй справы, ня ўглыбілася ў «дробязі», но перабудавала сваёй работы, а кіравала «наогул», «з паветра», замест справы займалася балбатняй, мітынгоўшчынай, канцыляршчынай, замест кіраўніцтва «канкрэтна, прадметна», абмяжоўвалася агульнымі фразамі і лёзунгамі.

Дырэктар камандваў работнікамі станцыі з гавінэту. «Зрабіць і ніякіх», «зрабіць, душа з вас вон», «на цісьніце і зрабеце, ведаць нічога не хачу» — вось узоры «кіраўніцтва».

Сакратар партыкалектыву агітаваў за савецкую ўладу, не ўглыбляючыся ў сутнасьць справы, а таму і ня маючы магчымасьці накіраваць волю і энтузіязм партыйнага і рабочага ядро станцыі на ажыцьцяўленьне канкрэтных задач.

Старшыня заўкому з галавою загруз у дробязях прафработы. Яны яго захліснулі, і да апошніх дзён ён ня мог з іх выбрацца. Не хапала баль шавіцкай рашучасьці, ня было ўменьня, а навучыць ня было каму — ЦК саюзу ў Маскве, а аршанскі райпрафсавет і ЦПСБ відавочна лічаць, што Белдрэс, як прадпрыемства «саюзнае», павінна «абслугоўвацца» толькі Масквой — і таму на Белдрэс нават не зазіраюць. Прафработа была перабудавана фармальна. Пляновыя прафкамітэты нічога не рабілі, бо іх ніхто амаль не інструктаваў. Курсы падрыхтоўкі новага прафактыву пасьля пераныбіраў фабзаўкомаў былі сапраўды на месца, раўняючы яго па дыкавых кратках.

Качагары пацелі, пот сьцякаў з твару брудным раўчакамі, мокрыя рубашкі прыліпалі да цела. Робячы ка роткую перадышку, качагары сплёўвалі чорную макроту, пілі цеплаватую ваду і з надзеяй паварочвалі твары да манометраў... Але ўсе імкненьні качагараў былі дарэмнымі. Стрэлкі манометраў паказвалі 9-10 атмасфэр замест патрэбных 28, і турбагенэратар ледзь задавольваў энэргіяй уласныя патрэбы станцыі. Торф — асноўны анкал топак — **не хацеў гарэць,** ня гледзячы на дапатак нафты, вугалю і дроў. Не хацеў гарэць таму, што ў ім было **каля 83 проц. вады.** Так, самай сапраўднай вады. А вада, як вядома, гарэць ня можа... Наадварот. Зноў такі ўсім вядома, што вада **гасіць агонь.** І, як упэўніліся **на 1-ай** Белдрэс, гасіць нават агонь **у 1.200 градусаў.**

У чым-жа справа? Чаму карміліі топкі іменна такім торфам, які загадзя асуджаў станцыю на разгрузкі? Ці-ж ня было другога торфу — больш сухога? Ці-ж нельга было знайсьці выхаду з гэтага становішча?

У чым-жа была прычына перабояў?

***

Прычына заключалася **у дрэнным кіраўніцтве.** Прычына была ў тым, што кіраўніцтва станцыі самым гаспадарчым чынам ігнаравала ўказаньні вебным чынам ігнаравала ўказаньні **Сталіна** на нарадзе гаспадарнікаў 23 чэрвеня мінулага году.

«Што патрабуецца для таго, каб наладзіць кіраўніцтва па - новаму? — пастаўў пытаньне тав. Сталін і ўказаў:

«Для гэтага патрабуецца перш за ўсё, каб нашы гаспадарчыя кіраўнікі зразумелі новую абстаноўку, вывучылі канкрэтна новыя ўмовы разьвіцьця прамысловасьці і перабудавалі сваю работу адпаведна з патрабаваньнямі ны па віню аршанскага райпрафсавету. Ня было кіраўніцтва сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам. Вопыт зьменна - сустрэчнага плянаваньня, праведзены вышэйшай брыгадай «Зьвязды» на эстакадзе ў брыгадзе Труфанава, ня быў перанесен у іншыя цэхі і брыгады.

Аб выкананьні 6 умоў тав. Сталіна толькі гаварылі, успамінальнем аб 6 умовах правадыра канчалі кожную мітынгоўную прамову, **але ні адна ўмова фактычна ня была выканана.**

Ні арганізаванага набору работай сілы, ні механізацыі працаёмкіх працэсаў, ня гледзячы на вялізарныя магчымасьці.

Ні барацьбы з цякучасьцю, ні ліквідацыі ўрэшпілаўкі і пачасоўшчыны.

Ні ліквідацыі абязьлічкі, хоць безадказнасьць за работу, машыны, абсталяваньне відавася ў вочы на кожным кроку.

Ні аўладаньня тэхнікай, ні работы па стварэньні вытворча - тэхнічнай інтэлігенцыі рабочай клясы.

Ні клопатаў аб старых кадрах спэцыялістаў, адданых сацыялістычнаму будаўніцтву.

Ні клопатаў аб унутрыпрамысловым пакаленьні, ні гаспадарчага разрахунку. Ці-ж гэта не паказальна, што **на Белдрэсе няма ні адной гаспадарча - разрахунковай брыгады,** ня гледзячы на німатлікія патрабаваньні ўдарнікаў дапамагчы ім перайсьці на гаспадарчы разрахунак?

Рацыяналізатарскія прапановы рабочых марыпаваліся месяцамі. З лёгкай рукі адпаго сакратара камсамольскай ячэйкі пайшла гуляць «тэорыя», што паволькі станцыя пабудавана паводле апошняга слова тэхнікі, то і рацыяналізацыі няма чаго. Ці-ж не характэрна, што на станцыі да сёньняшняга дня **няма яшчэ бюро рацыяналізацыі і вынаходзтва?**

Калі-б работнікі станцыі ўсялі ўказаньне тав. Сталіна аб тым, што трэба кіраваць «не наогул», не «з паветра», а канкрэтна, прадметна», калі-б яны сьледавалі завету **Уладзіміра Ільліча** аб тым, што **«трэба ўмець знайсьці ў кожны момант тое асобнае зьвяно ланцуга, за якое трэба ўсімі сіламі ўхапіцца, каб утрымаць увесь ланцуг і падрыхтаваць моцна пе раход да наступнага зьвяна»** (Ленін, красавік 1918 г.), — то яны-б убачылі апошнія «вузкія месцы» ў рабоце

15 транспартаў японскіх войск прыбыла у Шанхай

Акупанты рыхтуюцца да новых баёў

На магчымасьць мірных перагавораў няма пэрспэктыў

ШАНХАЙ, 13. **Газэта «Чайна прэс» лічыць, што ніякіх пэрспэктыў на магчымасьць мірных перагавораў зараз няма.** Кітайцы і японцы не змаглі дагаварыцца адносна ўмоў спыненьня ваенных дзеяньняў.

Учора ў Нанкіне, з удзелам Ван Цзін-вэя, Ло Вэнь-кана, Сун Цзе-вэна, Велінтона-Ку і іншых адбылася важная нарада. Падрабязнасьці невядомы, але думаюць, што нарада разглядала пытаньне аб становішчы ў Шанхаі і мірных перагаворах у сувязі з прыбыцьцём камісіі Ліґі нацый, якая чакаецца заўтра.

Кітайскія крыніцы паведамляюць аб прыбыцьці 15-ці японскіх морскіх транспартаў, на якіх пагружаны часьці 8-дывізіі і некалькі зьмешаных брыгад. Флётылія зараз знаходзіцца ля Усуна і пакуль яшчэ ня вырашана ці будуць прыбыўшыя часьці высаджаны ва Усуне або Люхэ.

На франтавой лініі Люхэ — Хуанду — Андзін спакойна, калі ня лічыць невялікай перастрэлкі з кулямётаў і стрэльбаў. Некаторае ажыўленьне наглядаецца ў раёнах Чанжу, Чанэй, Тазан, Цзянван, дзе японцы замацоўваюць артылерыйскія пазыцыі, якія раней знаходзіліся ў руках кітайцаў. (ТАСС).

20 параходаў салетры з Амэрыкі ў Японію

ВАШЫНГТОН, 12. Член палаты прадстаўнікоў Фіш заявіў, што за апошнія 2 месяцы з Хопвэлю (штат Віргінія) у Японію былі накіраваны **валя 20 параходаў гружаных салетрай.** З таго-ж парта 2 японскія параходы з вялікім грузам салетры былі накіраваны ва Францыю. Фіш указаў, што ён хутка выступіць у палаце прадстаўнікоў і патрабуе забараніць экспарт зброі і амуніцыі на Далёкі Усход.

Паводле вестак францускія і ангельскія паслы раіліся некалькі тыдняў таму назад з дзяржаўным дэпартаментам па пытаньні аб адпраўцы гэтых грузаў, прычым францускі пасол патрабаваў устрымацца ад умешваньня. Потым дзяржаўны дэпартамант прасіў камісію палаты прадстаўнікоў ня ставіць на абгаварэньне рэзалюцыю Фіша. (ТАСС).

Нанкін імкнецца да прыяцельскага вырашэньня канфлікту

ШАНХАЙ, 13. Нанкінскія газэты паведамляюць, што Тай-Ці-тао (старшыня экзамінацыйнай рады) у бліжэйшым будучым выяжджае ў Японію для неафіцыяльнага абмену думак адносна «прыяцельскага вырашэньня Японска - Кітайскага канфлікту».

Паветраныя налёты на Ханчжоу ня спыняюцца

ШАНХАЙ, 13. Японскія самалёты зноў зьявіліся над Ханчжоў (галоўны горад правінцыі Чжэцзян). Самалёты адкрылі кулямётны агонь, нарашчыны некалькіх жыхароў. Калі кітайскія зэнітныя гарматы адкрылі агонь на самалётах, апошнія схаваліся. Японскія самалёты зрабілі налёты над Суншзянам (станцыя на Шанхай - Ханьчжоўскай чыгунцы), Сіньчжэнам і Ітанам (станцыя на Шанхай - Ханьчжоўскай чыгунцы на поўдзень ад Фунцзяну).

Манзўр японскага імпэрыялізму

ШАНХАЙ, 13. Кідаецца ў вочы тая акалічнасьць, што японскія крыніцы ўзмоцнена пашыраюць чуткі аб вываздзе значных японскіх сіл назад у Японію, або пераходзны іх у Манчжурыю, дзе быццам зноў «стварацца небясьпека з боку паўстанчага руху». Аднак, падрабязнасьцей ня ўказваецца.

Адначасова цыркулююць чуткі аб малочым адбыцца расфармаваньні трэцяга японскага флёту, які нядаўна арганізован і прыслан у Шанхай у пачатку ваенных дзеяньняў. Японцы пашыраюць таксама чуткі аб значнай канцэнтрацыі кітайскіх войск у Шанхайскім раёне, аб прыбыцьці новых падмацаваньняў, аб прад'яўленьні рознымі кітайскімі арганізацыямі патрабаваньняў Нанкіну пачаць рашучую барацьбу за зварот захваченых японцамі тэрыторый у раёне Шанхаю. Пашыраньне гэтых чутак у кітайскіх колах Шанхаю ацэньваецца, як імкненьне стварыць уражаньне, што Японія гатова вывесьці войскі, але ня можа пайсьці на такую рызыку з прычыны таго, што кітайцы рыхтуюцца да нападу. Магчыма, што тэта мае сваёй мэтай таксама зрабіць уплыў на дзяржавы для таго, каб **дабіцца іх згоды на стварэньне нэйтральнай зоны вакол Шанхаю,** якая ахоўваецца сіламі нэйтральных дзяржаў (ТАСС).

„ЧАЙНА УІКЛІ РЭВ'Ю" АБ АДНОСІНАХ ПАМІЖ СССР І АМЭРЫКАЙ

ШАНХАЙ. У кітайскіх дыпляматычных колах указваюць на магчымасьць паступовага зьбліжэньня паміж ПАЗШ і СССР у рэзультаце пазэй на Далёкім Усходзе, узрастаючай агрэсіўнасьці Японіі, узмацненьня дружбы Японіі і Англіі, якая выяўляецца як у адносінах да шанхайскага, так і агульна - кітайскага пытаньняў. Некаторыя амэрыканскія прадстаўнікі ў Шанхаі намякалі на падобнага роду магчымасьць кітайскім дыпляматам, а таксама выказаню для неафіцыяльнага абмену думак адносна «прыяцельскага вырашэньня Японска - Кітайскага канфлікту».

Сёньня—урачыстае адкрыцьцё БДТ-3

Пралетарыят БССР, пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі стварае нацыянальную сацыялістычную культуру, навуку, мастацтва.

Адным з яркіх фактаў практычнага ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі зьяўляецца стварэньне **Трэцяга Беларускага Дзяржаўнага Тэатру,** які вырас на базе **вандроўнага тэатру** пад кіраўніцтвам народнага артыста БССР т. **Галубка.**

Сёньня, 15 сакавіка адбудзецца ў г. **Віцебску** ўрачыстае адкрыцьцё БДТ-3. Адкрыцьцё новага пралетарскага нацыянальнага тэатру ёсьць паказ актыўнага змаганьня пралетарыяту за вялікае бальшавіцкае мастацтва.

БДТ-3 павінен стаць **вострай зброяй** пралетарыяту ў клясавай барацьбе, павінен зараз-жа ўсімі сваімі спэцыфічнымі сродкамі арганічна ўключыцца ў пасьпяховае выкананьне задач пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Стрыжанем работы БДТ-3 будзе зьяўляцца барацьба за бальшавіцкую ідэйнасьць, за высокую мастацкую якасьць тэатральнай прадукцыі, за выпрацоўку дыялектыка-матэрыялістычнага творчага мэтаду пралетарскага мастацтва.

Ажыцьцяўленьне гэтых прынцыпаў магчыма толькі на аснове маркысцка-ленінскага сьветапогляду ў цеснай не парыўнай сувязі з практыкай сацыялістычнага будаўніцтва.

БДТ-3 для пасьпяховага пачатку свае работы павінен забясьпечыць **шчыльную сувязь з рабочымі масамі фабрык і заводаў,** шырокае разгортваньне пралетарскай **крытыкі і самакрытыкі** і сапраўдную бальшавіцкую работу ўсяго калектыву, усіх грамадзкіх арганізацый тэатру.

Перад тэатрам стаіць задача глыбокага паказу **бальшавіка-ленінца, ударніка — героя пяцігодкі.**

У галіне нацыянальна-культурнага будаўніцтва тэатр павінен разгарнуць барацьбу супроць ухілу ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі па даным этапе, супроць рэштак беларускага нацыянал-дэмакратызму і шавінізмаў іншых колераў.

Арабочваньне складу тэатру за лік лепшых ударнікаў, за лік камсамольцаў, выхаваньне новых мастацкіх пралетарскіх кадраў — таксама зьяўляецца найважнейшай задачай тэатру.

Справіцца з усімі задачамі, якія ставіць перад нашым тэатрам партыя, мы здолеем толькі з дапамогай шырокай пралетарскай грамадзкасьці, і ў першую чаргу пралетараў гор. Віцебску, дзе БДТ-3 мае сталую базу.

В. Бальзоўскі.

ПРЫВІТАНЬНЕ АД ГАЛОЎМАСТАЦТВА НКА

У дзень урачыстага адчыненьня БДТ-3 Галоўмастацтва НКА БССР горача вітае калектыў тэатру.

Арганізацыя Беларускага Трэцяга Дзяржаўнага тэатру зьяўляецца вынікам правільнага правядзеньня ленінскай нацыянальнай палітыкі. Толькі на аснове правядзеньня генэральнай лініі партыі, пралетарыят БССР дабіўся вялізарнейшых посьпехаў у галіне эканомікі, у галіне разгортваньня культурнай рэвалюцыі.

Задачай калектыву тэатру зьяўляецца барацьба за партыйнасьць у мастацтве, за стварэньне Магнітабуду мастацтва, за бальшавіцкае мастацтва.

Задачай калектыву тэатру зьяўляецца паставіць тэатр на выкананьне канкрэтных задач сацыялістычнага будаўніцтва. Дасягнуць гэтага можна пры ўмове яўнага даньня маркысцка-ленінскай тэорыяй, пры ўмове цеснай і непарыўнай сувязі з практыкай сацыялістычнага будаўніцтва.

Пад кіраўніцтвам КП(б)Б — створым Магнітабуды мастацтва.

Галоўмастацтва І. ГУРСКІ, П. ШАМШУР, Р. ПОЗЬНЯК.

Чыгуначны транспарт

У сакавіку пакрыць недавыкананьне лютага

Зводка выкананьня асноўных вымяральнікаў эксплёатацыйнымі раёнамі МББ і заходняй чыгункі за люты 1932 году

	Сярэдня-сутачныя вымяральнікі	Процант выкананьня плянавых заданьняў па эксплёатацыйных раёнах			
		Віцебск	Ворша	Гомель	Жлобін
1.	Прабег паравоза пасажырскага руху	—	105,3	114,1	94,66
2.	Прабег паравоза таварнага руху	75,5	89,6	94,7	87
3.	Прабег вагонатаварнага парку	93	79,3	97,7	82,37
4.	Камэрцыйная хуткасьць	94	95	97,9	91,76
5.	Тэхнічная хуткасьць	—	96,6	101,6	99,62
6.	Процант сьледаваньня цягнікоў паводле раскладу				
	а) пасажырскіх	38,3	80,5	81,5	—
	б) таварных	42	60,3	79,6	72,4
7.	Сутачная пагрузка	115,6	103,1	80,6	117
8.	Сутачная астача пад выгрузку	53	—	31,2	—
9.	Работа таварнага паравоза ў гадзінах	8,81	6,14	10,5	11,14
10.	Работа вагонаў у гадзінах	11,9	3,11	7,33	7,08

Зводка за люты паказвае паніжэньне крывой выкананьня раду асноўных вымяральнікаў у параўнаньні са студзенем. Процант хворых паравозаў павялічыўся па ўсіх раёнах. Прычым па Віцебскім раёне ён перавышае норму на 4,6 проц. у Жлобінскім раёне хворых паравозаў павялічылася супроць студзеня на 2,27 проц., хаця і няма перавышэньня заданай нормы. Толькі ў адным Гомельскім раёне процант хворых паравозаў ніжэй нормы.

Некалькі папізіўся сярэднясутачны прабег **таварных** паравозаў: у Віцебскім раёне на 6 проц. супроць студзеня, у Жлобінскім—на 3 проц., Аршанскім—на 2 проц. У Гомельскім раёне сярэднясутачны прабег у люты быў такі-ж як і ў студзені. Што-ж датычыць сярэднясутачнага прабегу **пасажырскіх** паравозаў, дык тут ёсьць павялічэньне па ўсіх раёнах апрача Жлобінскага.

Значна зьнізіліся камэрцыйная хуткасьць (асабліва па Жлобінскім раёне—на 7 проц.) і процант сьледаваньня цягнікоў паводле раскладу.

Апрача Віцебскага раёну ёсьць значныя павялічэньні карыснай работы таварнага паравоза ў гадзінах.

Лік здарэньняў у лютым дае рост па ўсіх раёнах на 240 выпадкаў.

Усё гэта сьведчыць аб тым, што па чыгунках не замацаваны посьпехі, якія дасягнуты ў выніку першага конкурсу спараных брыгад, што пасьля фінішу адразу-ж аслабла барацьба за плян, што 6 умоў тав. Сталіна яшчэ слаба рэалізуюцца.

Задача заключаецца ў тым, каб у сакавіку пакрыць падавыкананьне лютага і выканаць месячны плян. Трэба разгарнуць асаблівую жорсткую барацьбу за ўзьлім працоўнай дысцыпліны, за павышэньне эфэктыўнасьці работы паравознага парку. У сакавіку павінны быць да мінімуму зьнішчаны выпадкі здарэньняў на чыгунках.

ДЗЕСЯЦІГОДЗЬДЗЕ ЗАКАЎКАСКАЙ ФЭДЭРАЦЫІ

ПРЫВІТАНЬНЕ ЦК УсеКП(б) ПРАЦОЎНЫМ ЗСФСР

ЦК УсеКП(б) горача вітае рабочых і працоўнае сялянства Грузіі, Азэрбайджану і Арменіі ў дзень дзесяцігодзьдзя стварэньня Закаўкаскай Сацыялістычнай Фэдэрацыйнай Савецкай Рэспублікі.

Рабочыя і працоўнае сялянства Закаўказьзя, рука аб руку з усімі працоўнымі СССР, скінуўшы прыгнечаньне парыжыц, прагнаўшы меншавікоў, дашнакоў і мусаватыстаў, якія прабавалі ператварыць Закаўказьзе ў калёнію капіталістычных магнатаў Англіі і Францыі, прайшлі за гэтыя гады слаўны шлях барацьбы за перамогу сацыялізму.

Царызм, меншавікі, мусаватысты, дашнакі, распальвалі нацыянальную варожасьць у мэтах разьяднаньня працоўных Закаўказьзя. Ажыцьцяўляючы ленінскую нацыянальную палітыку, вы, таварышы, выканалі наказ Леніна, ператварылі за гэтыя гады Закаўказьзе «ва ўзор нацыянальнага сьвету нябывалага пры буржуазіі і немагчымага пры буржуазным ладзе» (Лекін).

Пры дапамозе ўсёй партыі бальшавікі Закаўказьзя ў барацьбе з правым і «левым» апартунізмам, вялікарасійскім шавінізмам і мясцовым нацыяналізмам ператварылі Закаўкаскую фэдэрацыю ў несакрушальную цытадэль сацыялізму, у апору пралетарскай рэвалюцыі.

Вы, таварышы, мацуючы савецкую ўладу і свой брацкі саюз, пры падтрыманьні працоўных СССР, з пячуранымі пры буржуазіі і немагчымымі пры буржуазным ладзе хуткасьцю і размахам разгортваеце гаспадарчы ўзьлім краіны Закаўказьзя. Баявы бакінскі пралетарыят, які зьяўляецца несакрушальнай апорай Закаўкаскай фэдэрацыі, скончыў пяцігодку за 2½ гады; у Грузіі, Азэрбайджане, Арменіі, Абхазіі, Аджарыстане будуюцца новыя электрастанцыі, разгортваецца здабыча марганцу і вугалю, каляровых металяў, растуць плошчы тэхнічных культур і новыя вытворчасьці.

Пасунулася наперад сельская гаспадарка. Дасягнуты сур'ёзныя посьпехі суцэльнай калектывізацыі і на гэтай аснове ліквідацыі кулацтва.

Але гэта толькі першыя крокі. Перамогі, атрыманыя вамі за гэтыя гады, даюць магчымасьць паскорыць гас падарчы і культурны ўзьлім Савецкіх Рэспублік Закаўкаскай фэдэрацыі, пакончыць на працягу другой пяцігодкі з тэхніка-эканамічнай і культурнай адсталасьцю.

Няўхільна ажыцьцяўляць індустрыялізацыю Закаўказьзя: завяршыць тэхнічную рэканструкцыю прамысловасьці, усямерна разьвіваць здабычу і пераапрацоўку нафты ў Азэрбайджане, паскорыць арганізацыю нафтавай прамысловасьці ў Грузіі, паставіць справу здабычы вугалю і каляровых мэталяў, будаваць гідраэлектрастанцыі, пашыраць бавоўнаводзтва і шаўкаводзтва і на гэтай аснове — тэкстыльную прамысловасьць.

У сельскай гаспадарцы Закаўказьзя закладзены гіганцкія магчымасьці разьвіцьця каштоўнейшых тэхнічных культур. Вам неабходна выкарыстаць гэтыя магчымасьці. Больш увагі ўздыму сельскай гаспадаркі, у асаблівасьці разьвіцьцю бавоўны, шоўку, рамі, тутуню, чаю.

Больш увагі арганізацыйна-гаспадарчаму і палітычнаму ўмацаваньню калгаснага руху на аснове дакладнага ўліку асаблівасьцяй кожнага раёну.

ЦК УсеКП(б) упэўнен, што рабочыя і працоўнае сялянства Закаўкаскай фэдэрацыі на чале са сваёй слаўнай бальшавіцкай арганізацыяй памножаць свае сілы ў барацьбе за выкананьне і перавыкананьне гаспадарчага пляну 1932 году і завяршэньне першай пяцігодкі ў барацьбе за пабудову бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Няхай жыве Закаўкаская Сацыялістычная Фэдэрацыйная Савецкая Рэспубліка!

Няхай жывуць рабочыя і працоўнае сялянства Закаўказьзя!

Няхай жыве баявы атрад УсеКП(б) — Закаўкаская партарганізацыя!

ЦК УсеКП(б).

Прывітальная тэлеграма т. Сталіну

Урачыстае пасяджэньне пленуму сумесна з прэзыдыумам і ЗакЦВК, Груз ЦВК, закпрафсавету, савпрофу Грузіі, партактывам, прафактывам, чырвонаармейскімі часьцямі і рабочымі-ўдарнікамі, прысьвечанае 10-годзьдзю Зак фэдэрацыі, шле табе, дарагі правадыр, палкае прывітаньне.

У шматгадовай і нястомнай рэвалюцыйнай барацьбе супроць усіх прыгнятальнікаў і эксплёататараў пралетарыят Закаўказьзя, разьбіваючы ўпчэнт правых і «левых» апартуністаў, няўмонна змагаючыся з вялікадзяржаўным і мясцовым шавінізмам, пад кіраўніцтвам ленінскай камуністычнай партыі і яе ЦК, дасягнуў вялізарных посьпехаў на ўсіх франтох сацыялістычнага будаўніцтва.

Пралетарыят Закаўказьзя на пароге 11-годзьдзя запэўняе ленінскі ЦК, што ён і надалей будзе таксама змагацца за сацыялізм, як ён змагаўся ўсе прайшоўшыя гады пад тваім кіраўніцтвам, кіраўніцтвам, якое з самага пачатку стварэньня Закфэдэрацыі дало магчымасьць пралетарыяту Грузіі, Арменіі і Азэрбайджану атрымаць такія бліскучыя перамогі. Пераможна выконваючы пяцігодку за чатыры гады, ЗСФСР народні з усімі рэспублікамі СССР мацуе абарону краіны і гатова па першым закліку свайго правадыра стаць на абарону сацыялістычнай бацькаўшчыны.

Прэзыдыум.

Буйная гандлёвая зьдзелка паміж Экспартлесам і Англіяй

МАСКВА. Пасьля доўгіх перагавораў з буйнымі імпарцэрамі Англіі Экспартлес заключыў дагавор на **продаж ім 2.110 тыс. кбм. піламатар'ялу з пастаўкаю на працягу бягучага году.** Для ажыцьцяўленьня гэтай буйнай зьдзелкі створана спэцыяльнае таварыства пад назвою **«Тымбэр дыстрыбюторз лімітэд»,** у склад якога ўваходзяць 160 ангельскіх лесагандлёвых фірм. Лясны рынак Англіі сустрэў стварэньне новага таварыства з вялікім заздаленьнем і 450.000 акцый, выпушчаных для пакрыцьця неабходнага капіталу, былі пакрыты з перавышэньнем.

Адначасовы продаж такой вялізарнай партыі лесу — надзвычай важны фактар ня толькі для рынку Англіі, але і для ўсяго Эўрапэйскага кантынгенту.

У САВЕЦЕ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР

Савет Народных камісараў БССР прадставіў 2-х тыдневы адпачынак старшыні СНК БССР тав. Галадзеду М. М. з 11 сакавіка 1932 г.

СНК БССР назначыў тав. Бондара другім намесьнікам Старшыні Дзяржаўнай Плянавай Камісіі пры СНК БССР.

СНК БССР назначыў тав. Рыўкіна А. А. памочнікам пракурора рэспублікі і членам калегіі пры Народным Камісары Юстыцыі БССР.

СНК БССР назначыў т. т. Цікамірава і Брандабоўскага членамі калегіі пры народным камісары фінансаў БССР.

СНК БССР назначыў тав. Гальдштейна намесьнікам начальніка галоўнай управы шашы, грунтавых дарог і аўтамабільнага транспарту БССР.

ПОЛЬСКА-ДАНЦЫГСКІ КАНФЛІКТ АБВАСТРАЕЦЦА

ДАНЦЫНГ, 13. Пасьля таго, як Польшча адмовіла Данцыгу ў захаваньні за ім права ўвозных кантынгентаў, якімі Данцыг карыстаўся нават пры абмежаваных увозных мерапрыемствах, паміж Данцыгам і Польшчай пачалася мытная вайна. Польшча патрабуе перадачы ёй поўнасьцю данцыгскага мытнага ведамства. Данцыгскі сэнат са свайго боку высоўвае рад патрабаваньняў, якія абмяжоўваюць эканамічную незалежнасьць вольнага гораду Данцыгу. Гэты канфлікт азначае новую фазу ў працяжнай і жорсткай барацьбе паміж Данцыгам і Польшчай.

Аб ходзе дровалесазагатовак і вывазкі ў першым квартале 1932 году

ПАСТАНОВА ЭКАНАМІЧНАГА САВЕТУ БССР

Заслухаўшы даклад Беллесправу, Быхаўскага і Асіпавіцкага леспрамгасаў аб ходзе дрова-лесазагатовак і вывазкі ў першым квартале, Эканамічны Савет БССР адзначае, што:

а) Пры здавальняючым становішчы загатовак лесаматар'ялаў і дроў (на 5 сакавіка выканана 93,8 проц. квартальнага пляну загатовак лесаматар'ялаў і 75,4 проц. дроў) ход вывазкі лесаматар'ялаў (56,2 проц.) і дроў (62,8 проц.) вараходзіць зусім нездавальняюча.

б) Ня выканана кулацка - заможнай часткай заданьне па лесавывазцы, асабліва па Быхаўскім (25 проц.) і Асіповіцкім (15 проц.) раёнах.

в) Ёсьць пагроза невыкананьня плянаў вывазкі лесу па Вуцяцкім, Бешанковіцкім, Дубровенскім, Менскім, Сіроцінскім і іншых раёнах.

Эканамічны савет БССР пастанаўляе:

1) Прапанаваць Беллесправу галоўную ўвагу сканцэнтраваць на вывазцы дроў і лесу, пераключыўшы значную частку рабочай сілы на дрова-загатоўкі.

2) Прапанаваць Беллесправу пад адказнасьць тав. Міленькага неадкладна праверыць, як спарыспоўваецца па вывазцы лесу ўласны абоз і трактары.

3. Прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам праверыць выкананьне пляну лесавывазкі па кожным сельсавеце і скончыць вывазку не пазьней 25 сакавіка. Забясьпечыць поўнае выкананьне даных кулацка - заможнай частцы заданьняў па лесавывазцы.

Старшыня СНК БССР — **Галадзед.**
Кіраўнік справаў — **Кандыбовіч.**
11 сакавіка 1932 году.

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

VII Усебеларускі Зьезд Прафсаюзаў

адкрываецца 15 сакавіка, у 6 гадзін вечара, у памяшканьні Дому Культуры.

ПАСЯДЖЭНЬНЕ ФРАКЦЫІ ЗЬЕЗДУ

адбудзецца 15 сакавіка, у 5 гадзін, у клюбе „Мэдсанпрацы"

15 сакавіка, у 2 гадз. дня, у залі ПАСЯДЖЭНЬНЯЎ ЦСПСБ адбудзецца

ПЛЕНУМ ЦЭНТРАЛЬНАГА САВЕТУ ПРАФСАЮЗАЎ БЕЛАРУСІ.

Яўка членаў і кандыдатаў пленуму абавязкова.

Чырвоная Зорка Каса—ад 1 гад. дня	З 12 сакавіка новы фільм **„КИРПИЧИКИ"**
Інтэрнацыянал Каса—ад 12 г. дня	РЫЧАРД ТОЛІЗДЭЙ у кінэдыі **САКРЭТ ХАРАСТВА** Кіно-хроніка—„НАШ УЛЬТЫМАТУМ"
ПРАЛЕТАРЫ Каса—ад 12 г. дня	ЗАМЕЖНЫ ФІЛЬМ **Чэмпіён сьвету** у 8 частках.
СПАРТАК	БРАНІНОСЕЦ ПАЦЭМКІН ЗВЫШ ПРАГРАМЫ БАБРУЙСКІ КАМБІНАТ у 2 частках

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „Чырвоная Зорка"

ДЗЕННЫЯ гукавыя сэансы для дзяцей. 15, 16 і 17 сакавіка

гукавы фільм **„КЕМ БЫЦЬ"** у 4 частках.

Гукавы фільм **„ПОШТА"** у 2-х частках.

Пачатак у 1 гадз. і 2 г. 30 м.

Па налетыўных заняткох ад школ і дзіцячых арганізацый прадстаўляецца **СКІДКА.**

ПРАЎЛЕНЬНЕ МЦРК

даводзіць да ведама ўсіх старшынь калгаспбюро і каапупаўнаважаных прадпрыемстваў і ўстаноў, што **з 15 сакавіка** праводзіцца прыём ад каапупаўнаважаных **сьпісаў і паявых кніжак** пайшчыкаў МЦРК **ДЛЯ ПЕРАРЭГІСТРАЦЫІ І ВЫДАЧЫ НОВЫХ.**

Прыём сьпісаў і паявых кніжак праводзіцца ў стале пайшчыкаў МЦРК (Калініна № 5) ад 12 гадзін да 7 гадзін вечара.

ПРАЎЛЕНЬНЕ МЦРК.

16 сакавіка, у 6 гадзін вечара, у памяшканьні Дому Чырвонай армії (вул. Энгельса) АДБУДЗЕЦЦА

НАРАДА САКРАТАРОЎ ячэек Асоавіяхіму

разам з членамі бюро ячэек асавіяхімаўстаноў па пытаньні—**апраўдзьбе Менгарсавету Асоавіяхіму.**

Менгарсавет Асоавіяхіму прапануе пад адказнасьць сакратароў ячэек забясьпечыць поўную яўку сяброў бюро.

Менгарсавет Асоавіяхіму.

Пры Беларускім Інстытуце харчавой прамысловасьці НКСБ — АДКРЫВАЮЦЦА — **6-месячныя ВЯЧЭРНІЯ КУРСЫ**

(без адрыву ад вытворчасьці) для рабочых і пазгасьніваў **па падрыхтоўцы да асеньняга набору ў Інстытут харчавой прамысловасьці** на аддзяленьні: 1) эканамічнае, 2) бродзільнае, 3) крухмала-патачна - вандытарскае, 4) мэханічнае.

На курсы прымаюцца асобы з адукацыяй ня ніжэй 6 груп сямігодкі.

Прыём заяў у канцылярыі Інстытуту харчавой прамысловасьці (Менск, Замляробчы зал, д. № 4, у будынку хэміка-тэхналёгічнага Інстытуту) ад 9 да 4 гадз. дня і ад 7 да 9 гадз. веч.

Тэрмін падачы заяў **да 25 сакавіка.** Пачатак заняткаў 1-га красавіка.

Дакументы прадстаўляюцца, згодна даведніку НКА, у арыгіналах.

Інтэрнатам і стыпэндыяй курсанты незабясьпечваюцца.

Дырэкцыя Інстытуту.

ПАТРЭБНА пішучая машынка

Зварачацца ў выд-ва **„ЗЬВЯЗДА"** Савецкая, 63, 2-гі паверх.

16 сакавіка ў 6 гадзін — адбудзецца —

шырокая нарада

выкладчыкаў, сэмінараў і груп замежных моў Інстытуту Літаратуры БАН па пытаньні якасьці работы кожнага сэмінару і выкладчыка.

ШУКАЮ кватэру на адну асобу плачу за пятнаццаць наперад, забясьпечваю апалам. Зварачацца: Чырвонаармейская, Дом Калгасьніка, Белкалгасцэнтр. Аргмасавы сэктар, Семінкоў, тэл. 14-05.

МАШЫНІСТКА перакладчыца, знаёмая з сакратарскай справай, шукае месца. Адрас: Паўночны (Северный) завул № 15, кв. 1, Фінскай вуліцы Д.

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ

ЛІТАРАТУРА ДА ДНЯ

СЭКТАР КНІГАГАНДЛЮ ДВБ Менск, Пляц Волі 5

Парыскай камуны і МОПР'у.

МАСПАР ТПАЛІТсэктар

Рубінштэйн І Модзст.—Сусьветны эканамічны крызэс капіталізму. Ц. 85 к.
Сьцяпанаў.—Парыская камуна 1871 г. і пытаньні тактыкі ў пралетарскай рэвалюцыі Ц. 1 р. 25 к.
Тэнераў С.—Рэвалюцыя 1848 г. у Францыі і Германіі. Ц. 20 к.
Хапна.—Рабочы рух у калёніях Усходу (Індыя, Інданэзія, Індо-Кітай, Філіпіны, Карэя, Фармоза). Ц. 90 к.
Алі Махамад.—Пралетарыят Індыі. Ц. 20 к.
Буданцоў.—Форпост Індыі. Ц. 40 к.
Богін Д.—Заходняя Беларусь пад крывавым бізуном акупантаў. Ц. 3 к.
Вісьліцкі.—Польшча. (Клясы, партыі і саюзы моладзі сусьвету). Ц. 15 к.
Гаек.—Жыцьцё і барацьба Чэха-Славацкіх рабочых. Ц. 10 к.
Данішэўскі.—Жыцьцё і барацьба польскага пралетарыяту. Ц. 10 к.
Дзінгін Ф.—Як жывецца пралетарыяту ў Англіі. Ц. 7 к.
Жданаў і Тапэка.—Японскі Імпэрыялізм у Манчжурыі. Ц. 20 к.
Заводзкі.—Як жыве і змагаецца Французкі пралетарыят. Ц. 15 к.
Зюзькоў.—Крывавы шлях беларускай нацдэмакратыі. Ц. 35 к.
Ілін А.—За Савецкі Кітай. Ц. 55 к.
Іванаў Б.—Сучасная навольніцтва ў калёніях і паўкалёніях. Ц. 40 к.
Іозеф.—Клясы, партыі і саюзы моладзі Венгрыі. Ц. 15 к.
Іозеф.—Рэвалюцыйны ўздым у Венгрыі Ц. 20 к.
Качар'янц Г.—І н д ы я. Ц. 15 к.
Нашэн.—Французкі імпэрыялізм рыхтуе вайну супроць СССР. Ц. 10 к.
Маноэар-Мусо.—Прымусовая праца ў Індакітаі. Ц. 12 к.
Мінскі Г.—Сацыял-фашысты пры ўладзе. Ц. 90 к.
Нікопецыці.—Італьянскі пралетарыят пад уладай фашызму. Ц. 7 к.
Падмор.—Негры пад прыгнётам імпэрыялізму. Ц. 20 к.
Пастун Е. Г.—У нас і ў іх. Ц. 10 к.
Рабэт О.—Барацьба французкіх рабочых Ц. 14 к.
Рухаючыя сілы Гішпанскай рэвалюцыі. Ц. 12 к.
Сіхла Ф.—Румынія. Ц. 22 к.
Султан Задэ.—Пэрсія. Ц. 20 к.
Уладзімераў А.—Баўтарыя. Ц. 35 к.
У фашысцкай Польшчы. Ц. 29 к.
Я-чэрдаў.—Заходняя Беларусь. Ц. 35 к.
Гурніч Я.—Пятля на шыі польскага гарнізна сьцісгаецца. Ц. 45 к.
Гападоўскі.—Сацыял-фашысты перад фашысцкім судом. Ц. 15 к.

ЮНДЗЕТсэктар.

Віктароў. Гісторыя аднаго сьцягу. Ц. 25 к.
Ийвер.—У новай Каледоніі Ц. 1 р. 25 к.
Гюго В.—Гаўрош. Ц. 20 к.
Гра Ф.—Марсельцы. Ц. 45 к.
Лебедзеў і Абугаў.—Шанхай будзе чырвоным. Ц. 12 к.
Гумілеўскі.—Чорны Джардзі. Ц. 15 к.
Вейтноў.—Дзеці змаганьня. Ц. 10 к.
Комрад.—Дзяўчаты ў астрогах. Ц. 12 к.
Вольноўскі.—Сьмерць на варце. Ц. 15 к.
Бела Іляш.—Вецер з Усходу. Ц. 16 к.
Тамбэліні.—Паэма аб Эджвудзе. Ц. 25 к.
Ротшэйр.—Шлях у Масаву. Ц. 20 к.
Нароці.—Гары Ляман. Ц. 10 к.
Алаэ.—Падпольныя пяцігодкі. Ц. 15 к.
Лебедзеў.—Камсамол на глёбусе. Ц. 60 к.

НАЦсэктар.

(НА ЯЎРЭЙСКАЙ МОВЕ).

Ленін.—Парыская камуна. Ц. 20 к.
Юдыцкі.—Парыская камуна. Ц. 60 к.
Зборнік.—Парыская камуна. Ц. 90 к.
Найкранц.—Барыкады ў Вадыме. Ц. 1 р. 15 к.
Зборнік.—На барыкадах. Ц. 32 к.
Карл Маркс.—Грамадзянская вайна ў Францыі. Ц. 60 к.
Онунёў.—Парыская камуна (п'еса) Ц. 35 к.
Дравдоў.—Унучак камунара. Ц. 60 к.
Розін.—Мы інтэрнацыяналісты. Ц. 18 к.
Юльскі.—Эканамічны крызіс і рэвалюцыйны ўздым у Польшчы. Ц. 20 к.
Рубінштайн.—Эканамічны крызіс у Польшчы. Ц. 35 к.
Ілін.—Савецкі Кітай. Ц. 90 к.
Олымінскі.—У турме. Ц. 1 р. 20 к.
Ірнутаў.—Паход на Вашынгтон. Ц. 40 к.
Гусеў.—СССР—братэрскі саюз народаў. Ц. 5 к.
Грынберг.—Пылаючы Рур. Ц. 1 р. 80 к.

(НА ПОЛЬСКАЙ МОВЕ).

Краўчанка.—Як капіталісты ўсіх краін прыгнечваюць слабыя народы. Ц. 60 к.
Фэлінс Кон.—Пад сьцягам рэвалюцыі. Ц. 70 к.
Старка.—За рубяжом. Ц. 30 к.
Нуйоўскі.—Як жыве польскі рабочы. Ц. 35 к.
Сахацкі.—Польскі сацыял-фашызм і інтэрвэнцыя супроць СССР, Ц. 25 к.
Васілеўскі.—Фашысцкая Польшча і вайна супроць СССР. Ц. 35 к.
Ленскі.—На шляхах да рэвалюцыйнага крызісу ў Польшчы. Ц. 20 к.
Бройдэ.—У белгіпанскім палоне. Ц. 95 к.

ОБЩЕСТВО ПРОЛЕТАРСКОГО ТУРИЗМА И ЭКСКУРСИЙ ОПТЭ

АПЭР.-ЭКС. СЭКТАР ЦС „ОПТЭ" АРГАНІЗУЕ ПАДАРОЖЖЫ ПА УСІХ РАЁНАХ СССР ПА АБМЕНЕ ВЫТВОРЧЫМ ВОПЫТАМ

ПАМІЖ ПРАМЫСЛОВЫМІ ПРАДПРЫЕМСТВАМІ, САЎГАСАМІ, КАЛГАСАМІ І МТС

І па вывучэньні сац. будаўніцтва і краязнаўства.

Турыстам прадастаўляецца